ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЛІСТАПАДА 2013 г. ЧАЦВЕР № 224 (27589) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Ці можа «суровы металург» быць… Дзедам Марозам?

Манітор для геймера — не заслона ад свету

КАРАТКА

Рэчавы рынак патрыманых тавараў (так званае поле цудаў) у ГД «Ждановічы» плануецца закрыць са снежня. Прадаўцам патрыманых тавараў будуць прапанаваны свабодныя месцы на гандлёвых радах.

Нацыянальная авіякампанія знізіла тарыфы на пералёт з 15 студзеня па 25 напрамках. Цэны на білеты па асобных маршрутах зменшаны больш як на 50 працэнтаў. Спецыяльная прапанова датычыцца ў тым ліку пералётаў з Мінска ў Амстэрдам, Стакгольм, Гановер, Прагу, Парыж, Хельсінкі, Тэль-Авіў, Тэгеран, Лондан, Жэневу, Ларнаку, Рым.

У Мінску ў студзені-кастрычніку гэтага года самая высокая сярэднямесячная заработная плата была ў арганізацыях, звязаных з вылічальнай тэхнікай (Br12 млн 993,5 тыс.) і паветраным транспартам (Br10 млн 505,4 тыс.).

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.11.2013 г.

Долар ЗША	9330,00	▲
Еўра	12670,00	▲
Рас. руб.	282,50	■
Укр. грыўня	1137,18	▲

ЛІЧБА ДНЯ

у 2,5 раза

перавысіў сярэдні памер пенсій у кастрычніку бюджэт пражытачнага мінімуму для пенсіянераў (у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў гэты сацыяльны нарматыў у разліку на адзін месяц на перыяд з 1 жніўня па 31 кастрычніка складаў Br849,9 тыс.). Пры гэтым сярэдні памер пенсій па ўзросце склаў Br2 млн 179,8 тыс., па інваліднасці — Br1 млн 915,7 тыс., з нагоды страты кармільца — Br1 млн 387,9 тыс., сацыяльных пенсій — Br946,1 тыс.

ISSN 1990 - 763X

■ Погляд у будучыню

Фота БЕЛТА.

ВУЧЫЦЦА НІКОЛІ НЕ ПОЗНА

У МАГІЛЁВЕ ПАЧАЎ РАБОТУ МІЖНАРОДНЫ ФОРУМ МАЛАДЫХ ЖУРНАЛІСТАЎ

Адначасова столькі пішучай і здымаючай журналісцкай браціі Магілёў не бачыў даўно. У другім міжнародным форуме «Агульны погляд у будучыню», арганізаваным сумеснымі намаганнямі Міністэрства інфармацыі РБ, Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы, Беларускага саюза журналістаў, Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і Магілёўскага аблвыканкама, прымае ўдзел больш чым 150 прадстаўнікоў беларускіх і замежных СМІ. Гэта ўсе тыя, хто думае крэатыўна і самабытна. Акрамя моладзі, у Магілёў прыехалі прафесіяналы, медыяэксперты і кіраўнікі буйных выданняў.

У адкрыцці форуму прынялі ўдзел міністр інфармацыі Беларусі Алег Праляскоўскі, намеснік дзяржсакратара, член Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы Іван Бамбіза, прадстаўнікі Беларускага саюза журналістаў, мясцовай улады, вядучых расійскіх і беларускіх СМІ. Яны пазнаёміліся з выставай масмедыя і друкаваных выданняў, якая працавала падчас адкрыцця форуму ў фае гасцініцы «Турыст». Вялікую зацікаўленасць, дарэчы, выклікаў стэнд ТРК «Магілёў». Гэта тэлерадыёкампанія робіць шмат праектаў з выхадам не толькі на рэгіён, але і на рэспубліку.

— У гэтага форуму некалькі задач, але галоўнымі з'яўляюцца прафесійныя кантакты, стасункі паміж маладымі журналістамі, знаёмства з нашай краінай, — адзначыў у сваім уступным слове Алег Праляскоўскі. — Маладыя журналісты — гэта той асаблівы пласт, які больш жыва і чула ўспрымае жыццё. Міжнародная вучоба — вельмі важная падзея для іх.

Самі ж маладыя калегі кажуць, што форум для іх — сапраўднае свята.

— Я першы раз на такім мерапрыемстве, — падзяліўся ўражаннямі карэспандэнт газеты «Знамя шахтёра» з Растоўскай вобласці Максім Цішчанка. — Вельмі падабаецца атмасфера. А яшчэ спадзяюся шмат чаму навучыцца.

На гэты раз журналісцкі форум пашырыў свае межы. У ім прымаюць удзел госці не толькі з Расіі, але і з Арменіі і Казахстана. Магілёў жа выбраны для месца сустрэчы невыпадкова. Сёлета ён з'яўляецца культурнай сталіцай краін СНД і Беларусі. Тут працуюць каля 70 розных СМІ.

Што да форуму — тут будуць арганізаваны майстар-класы з удзелам карыфеяў айчыннай і замежнай журналістыкі, «круглыя сталы» і дыскусіі. Маладыя журналісты пазнаёмяцца з вопытам работы магілёўскай тэлерадыёкампаніі і прымуць удзел у запісы ток-шоу «Перазагрузка».

У рамках форуму адбудзецца таксама ўрачыстая цырымонія ўручэння прэміі «Дэбют» ад Беларускага саюза журналістаў. Як адзначыў яго старшыня Анатоль Лемяшонак, па сваёй значнасці яна прыраўноўваецца да прэміі галоўнага конкурсу БСЖ «Залатое пяро».

Нэлі ЗІГУЛЯ

■ Святло ў акне

ПРОСТА СТАЛА ЯГО ШКАДА...

Адзінокага пажылога чалавека пасялілі ў сваім доме сацыяльныя работнікі з Пухавіцкага раёна

«За гуманізм і міласэрнасць, за ўкараненне новага віду абслугоўвання «Прыёмная сям'я» — такой граматай узнагароджана сямейная пара сацыяльных работнікаў Захарэвічаў з Пухавіцкага раёна.

...У адзін з працоўных дзён Тамара Захарэвіч сустрэла па дарозе пажылога чалавека: адразу было відаць, што яму патрабуецца дапамога. Не толькі паводле прафесійнага абавязку, але і з простай чалавечай спагады яна пацікавілася, чаму ён такі засмучаны. У адказ той заплакаў. Жанчына прывяла незнаёмца дахаты, накарміла, напаіла гарбатай, а ўжо потым выслухала яго гісторыю: адзінокі, не мае ні даху над галавой, ні нават дакументаў. На сямейным савеце разам з мужам вырашылі: дом вялікі, няхай жыве. Пасялілі новага жыхара ў асобным пакоі, забяспечылі ўсім неабходным, што патрэбна чалавеку яго ўзросту. А самае галоўнае — пачалі аб ім клапаціцца. І ціск памераюць, і газету пачытаюць, і тэлеперадачы разам паглядзяць. Святы сустракаюць за кубкам гарбаты і салодкім сталом.

СТАР. 4

■ Добрая навіна

ДЗІЦЯЧЫ ЎРАЧ ЦЯПЕР ПОБАЧ

Дзіцячая паліклініка нарэшце адкрылася ў адным з самых маладых раёнаў Гомеля. Улазіны гарадскія ўлады прымеркавалі да 70-годдзя вызвалення абласнога цэнтра ад фашысцкіх захопнікаў.

Новы аб'ект, які пачалі будаваць пяць гадоў таму, прызначаны для абслугоўвання дзяцей пяці мікрараёнаў новабудоўляў. Між іншым, іх тут жыве каля 15 тысяч. Раней матулям прыходзілася вазіць дзяцей у іншыя раёны горада, што выклікала зразумелае абурэнне жыхароў горада.

Па словах спецыялістаў, аб'ект разлічаны на 200 наведванняў у змену, мае плошчу 1290 кв.м. На абсталяванне паліклінікі з гарадскога бюджэту было выдаткавана больш за Br9,6 млрд. Акрамя таго, на набыццё лабараторнага абсталявання накіравана звыш Br4 млрд. Паліклініка мае сучаснае фізіятэрапеўтычнае і бальнеалагічнае абсталяванне, у тым ліку невялікі басейн.

Дарэчы, установа для лячэння дзяцей — першы этап будаўніцтва шматпрофільнага паліклінічнага комплексу ў мікрараёне. На чарзе — стаматалагічнае аддзяленне. Далей плануецца будаўніцтва даросlай паліклінікі, разлічанай на 800 наведванняў у змену.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

■ Парламенцкі дзённік

ЗАКОН СУПРАЦЬ ВЫСОКІХ ЦЭН

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ ЎХВАЛІЎ НОВУЮ РЭДАКЦЫЮ АНТЫМАНАПОЛЬНАГА ЗАКОНА

На ўчарашнім пасяджэнні трэцяй сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі сенатары разгледзелі 15 законапраектаў, у тым ліку 10 ратыфікацый міжнародных пагадненняў. Сярод ухваленых законапраектаў — новая рэдакцыя антыманапольнага закона, які павінен абмежаваць з'яўленне ў Беларусі тавараў і паслуг з эканамічна неабгрунтаванымі цэнамі.

РОЎНЫЯ ЎМОВЫ

— Больш за 10 гадоў у закон аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі не ўносілася ніякіх змен, таму наспела неабходнасць істотна абнавіць дакумент, прывесці яго ў адпаведнасць з рэаліямі нашай эканомікі,— пракаментаваў журналістам праект новага закона **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ.**— Да таго ж у снежні 2010 года было падпісана пагадненне ў рамках Адзінай эканамічнай прасторы аб правілах і прынцыпах канкурэнцыі, у адпаведнасць з якім мы павінны прывесці наша антыманапольнае заканадаўства. Нарэшце, законапраект устанаўлівае адзіныя падыходы для ўсіх суб'ектаў рынку, незалежна ад формы ўласнасці, устанаўлівае аднолькавыя правілы гульні і магчымасці для выкарыстоўвання рэсурсаў. Новы закон чакаюць ад нас Казахстан і Расія, якія ўжо ўхвалілі адпаведныя дакументы. Гэта дазволіць прыняць на Еўразійскай камісіі модульны антыманапольны закон, які ўстановіць агульныя правілы паводзін для ўсіх удзельнікаў АЭП.

Пасля прыняцця новай рэдакцыі закона аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі аналагічны закон 1992 года будзе адменены. Пры гэтым пераемнасць з дзеючым законам захаваецца. Законапраект па-ранейшаму ўстанаўлівае забарону на манапалістычную дзейнасць і нядобрасумленную канкурэнцыю, адказнасць за парушэнне антыманапольнага заканадаўства. Акрамя таго, ён пашырае паўнамоцтвы антыманапольнага органа.

У праекце закона карэктуецца норма аб крытэрыях дамінуючага становішча. Дамінуючым прызнаецца гаспадарчы суб'ект, доля якога на рынку складае 35% і больш. Пры долі на рынку не больш за 15% становішча гаспадарчага суб'екта не можа быць прызнана дамінуючым.

Законапраект таксама прапісвае, што антыманапольнае заканадаўства ў нашай краіне будзе прымяняцца да ўсіх гульцоў рынку аднолькава, незалежна ад формаў уласнасці, арганізацыйна-прававой формы і месца рэгістрацыі. Яшчэ адно новаўвядзенне — распаўсюджванне дзеяння антыманапольнага заканадаўства на рынкі фінансавых паслуг.

— Рэалізацыя гэтага дакумента павінна забяспечыць роўныя ўмовы дзейнасці суб'ектаў прадпрымальніцтва, свабоду руху тавараў і свабоду эканамічнай дзейнасці, што з'яўляецца асновай для развіцця канкурэнцыі на таварных рынках, і будзе садзейнічаць павышэнню інвестыцыйнай прывабнасці краіны,— сказаў у сваім выступленні перад сенатарамі **намеснік міністра эканомікі Антон КУДАСАЎ.**— Антыманапольны закон будзе таксама стымуляваць удзельнікаў таварных рынкаў да спаборніцтва ў вытворчасці і рэалізацыі тавараў, забяспечыць штуршок для правядзення мадэрнізацыі на беларускіх прадпрыемствах, павышэнне якасці тавараў і паслуг на айчынным рынку, што прывядзе да больш усебаковага задавальнення спажыўцоў і ўстанаўлення эканамічна абгрунтаваных цэн.

Адказваючы на пытанні сенатараў, Антон Кудасаў заўважыў, што прыняцце законапраекта дасць магчымасць уключыць яшчэ адзін інструмент па ліквідацыі выключэнняў у Мытным саюзе. Дакумент дазволіць як бізнесу, так і органам улады ініцыіраваць адпаведныя прапановы ў Еўразійскую эканамічную камісію. У гэтым годзе страты ад выключэнняў у МС Мінэканомікі Беларусі ацэньваюцца на ўзроўні $3,5 млрд, або каля 5 працэнтаў ВУП краіны.

НЕ ТОЛЬКІ «БЕЛПОШТА»

Савет Рэспублікі адобрыў таксама папраўкі ў закон «Аб паштовай сувязі», важнай адметнасцю якога з'яўляецца скарачэнне пераліку выключных правоў нацыянальнага аператара паштовай сувязі.

— Гэтая норма дасць магчымасць легалізаваць дзейнасць транснацыянальных паштовых кампаній у Беларусі,— патлумачыў журналістам **намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Мікалай СТРУКАЎ.**— Цяпер фактычна яны займаюцца дастаўкай тавараў. Такія кампаніі самі заявілі аб тым, што хацелі б легалізаваць сваю дзейнасць. Але пры гэтым наўрад ці транснацыянальныя паштовыя кампаніі будуць прыходзіць на сельскія тэрыторыі, дзе працаваць не так выгадна. Таму папраўкі прадугледжваюць, што ў вёсцы паштовая сувязь па-ранейшаму будзе гарантавана за кошт асноўнага нацыянальнага аператара.

Сваю дзейнасць у Беларусі плануюць развіваць пяць міжнародных паштовых кампаній. Мікалай Струкаў адзначыў, што яны ўжо адкрылі свае прадстаўніцтвы не толькі ў Мінску, але і ў рэгіёнах. У работу гэтых кампаній інвестуюцца як замежны, так і беларускі капітал.

Акрамя таго, папраўкі замацоўваюць на заканадаўчым узроўні такія паняцці, як «кур'ерская сувязь» і «кур'ерскія паслугі». Фактычна кур'ерская сувязь вылучаецца ў самастойны від паштовай сувязі.

УМОВА БЯЗВІЗАВАГА РЭЖЫМУ

Сярод ухваленых Саветам Рэспублікі ратыфікацый — пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Турэцкай Рэспублікі аб рэадмісіі, якое было падпісана ў Мінску 29 сакавіка 2013 года. Гэты дакумент патрэбны для таго, каб паміж дзвюма краінамі пачаў працаваць бязвізавы рэжым.

«Дэпартацыя аднаго чалавека будзе каштаваць 300 еўра,— паведаміў **намеснік міністра ўнутраных спраў Мікалай МЕЛЬЧАНКА,** які прадстаўляў дакумент у верхняй палаце парламента.— Законапраект аб ратыфікацыі пагаднення аб рэадмісіі для таго і прымаецца, каб абодва бакі неслі гэтыя расходы.»

За рэалізацыю пагаднення аб рэадмісіі з беларускага боку будуць адказваць МУС Беларусі і Дзяржпагранкамітэт, з турэцкага — МУС Турцыі. Дзеянне дакумента аб рэадмісіі будзе распаўсюджвацца і на працоўных мігрантаў, і на тых, хто едзе праз Беларусь транзітам. У тым ліку для гэтага ў Мінску ствараецца рэадмісійны цэнтр. Чакаецца, што пасля адкрыцця цэнтра вясной будучага года пачне працаваць бязвізавы рэжым з Турцыяй.

Згодна з прынятымі дакументамі, грамадзяне Беларусі змогуць знаходзіцца на тэрыторыі Турцыі на працягу 30 дзён з даты ўезду, не афармляючы візы. На працягу аднаго года можна будзе ўязджаць на турэцкую тэрыторыю без візы шматразова, але агульны тэрмін такога знаходжання не павінен перавышаць 90 дзён.

Бязвізавы рэжым не будзе распаўсюджвацца на паездкі з мэтай работы (за выключэннем перавозак пасажыраў і грузаў), вучобы, навуковай дзейнасці, аб'яднання сям'і і пражывання. Грамадзяне Турцыі і Беларусі змогуць ажыццяўляць паездкі без віз, калі яны выязджаюць для правядзення дзелавых перагавораў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

ЛЁС ВАЕННАПАЛОННЫХ — БОЛЬ НЕ ТОЛЬКІ БЕЛАРУСІ



Генерал-лейтэнант у адстаўцы Яўген МІКУЛЬЧЫК заклікае далучыцца да праекта «Урочышча Пяскі» народы-пераможцы ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў.

— На тэрыторыі Беларусі знішчана больш за мільён савецкіх ваеннапалонных. У адных магілах, разам, ляжаць радавыя і камандзіры, прадстаўнікі розных народаў Савецкага Саюза. Гэта не толькі боль Беларусі,— расказаў Яўген Васільевіч журналісту «Звязды».— Таму, калі ў Беларускі саюз афіцэраў звярнулася дэпутат Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля Васільеўна Гуйвік па пытанні ўвекавечвання памяці больш за 40 тысяч ваеннапалонных і грамадзянскага насельніцтва ва ўрочышчы Пяскі ў Полацку, я паведаміў пра гэта на пасяджэнні Каардынацыйнага савета ветэранскіх арганізацый краін СНД у Маскве, які ўзначальвае адмірал флоту Аляксей Іванавіч Сарокін. Гэта агульны боль краін СНД.

Нам трэба і на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў узняць гэту праблему.

Калі быў падлеткам, то бачыў, як распраўляліся фашысты з савецкімі ваеннапалоннымі. Відавочцы расказвалі, як немцы ў мінскі лагер для ваеннапалонных, які знаходзіўся побач з Домам афіцэраў, прывезлі бочкі з селядцом, а як толькі ваеннапалонныя падыходзілі да Свіслачы, каб вады напіцца, іх расстрэльвалі ва ўпор…

Я сказаў старшыням ветэранскіх арганізацый краін СНД: «Як сяброўства стала адной з умоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, так няхай сяброўства дапаможа нам аднавіць справядлівасць у дачыненні да савецкіх ваеннапалонных». І Беларусі, і ўсім былым рэспублікам СССР неабходна далучыцца да акцыі па зборы сродкаў на мемарыял ва ўрочышчы Пяскі. Акрамя полацкага, патрэбен і цэнтральны комплекс у Мінску альбо пад Мінскам, дзе можна будзе ўшанаваць памяць ваеннапалонных салдат Чырвонай Арміі ва ўсім свеце.

Гэтую тэму трэба ўздымаць. Я казаў пра яе і на IX з'ездзе Беларускага саюза афіцэраў, які адбыўся 22 лістапада ў Мінску. Збіраюся казаць і на чарговым пасяджэнні Рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 70-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і перамогі савецкага народу ў Вялікай Айчыннай вайне.

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі пералічыў на будаўніцтва мемарыяла «Урочышча Пяскі» 23 мільёны рублёў.

— Гэта былі грошы, зароблены ў рамках руху студэнцкіх і добраахвотных атрадаў Віцебскай абласной арганізацыі БРСМ падчас моладзевай працоўнай акцыі «Маладосць. Традыцыі. Будучыня», якая праходзіла ў перыяд з 25 красавіка па 10 кастрычніка 2013 года,— паведаміў «Звяздзе» **першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ігар БУЗОЎСКІ.**— Падобныя акцыі — гэта не проста пералічэнне грошай, гэта выхаванне працай і выхаванне гісторыяй. Таму мы надаём вялікае значэнне выбару аб'ектаў, якія яна ахоплівае. У выніку моладзь больш даведваецца пра малавядомыя старонкі Вялікай Айчыннай вайны і дапамагае аднавіць гістарычную справядлівасць, ушанаваць памяць продкаў. У юбілейны год вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў мы плануем прыняць рашэнне аб падключэнні да падобнай акцыі ўсёй краіны. Гэта будуць не толькі Пяскі, але цэлы спектр аб'ектаў, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной. Мы спадзяёмся таксама аб'яднаць у гэтым праекце моладзь краін СНД.

Фота Надзеі БУЖАН.

Былы кіраўнік ваенна-патрыятычнага клуба «Разведчыкі воінскай славы» Яўгенія ТРАПЕЗНІКАВА і дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля ГУЙВІК каля Сцяны памяці ва ўрочышчы Пяскі.

За лістапад на дабрачынны рахунак па зборы сродкаў на стварэнне мемарыяла «Урочышча Пяскі» было пералічана 21 458 757 рублёў. Усяго на спецыяльным рахунку Віцебскага аддзялення Беларускага Фонду міру на 26 лістапада знаходзілася 112 млн 703 тысячы рублёў. Нагадаем, што для будаўніцтва мемарыяла ва ўрочышчы Пяскі ў Полацку, дзе амаль на паверхні зямлі ляжаць астанкі савецкіх салдат, партызан і падпольшчыкаў апошняй вайны, патрэбна каля 5 млрд беларускіх рублёў.

Самае дзіўнае, што найбольшыя сумы пералічваюць, як правіла, пенсіянеры. Людзі, чый даход у нашай краіне не назавеш вялікім. Але гэтыя людзі памятаюць альбо саму вайну, альбо яе наступствы. Мы — забываем. І гэта страшна. Нам неабходна памятаць, каб зямля не закрычала Нябёсам пра нашу абыякавасць. Каб пустэча ў нашай душы не нарадзіла магчымасці новай несправядлівасці, новага болю і гора, трэба яе запоўніць памяццю, спачуваннем і гонарам за тых, хто за калючым дротам, у нечалавечых умовах застаўся свабодным, застаўся Чалавекам.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Грошы на стварэнне мемарыяла «Урочышча Пяскі» можна пералічваць у Віцебскае абласное аддзяленне ГА «Беларускі фонд міру» на рахунак
№3135411066036 (у беларускіх рублях),
№3135411066502 (у доларах),
№3135411066805 (у расійскіх рублях)
у дырэкцыі ААТ «Белінвестбанк» па Віцебскай вобласці, код 153001739, УНП 300126736

КАЛІ ВЫШЫНЯ МАЕ ЗНАЧЭННЕ,

ці Выбіраем елку

Міністэрства лясной гаспадаркі абвясціла сярэднія цэны на навагоднія дрэвы, якія хутка прапануюць пакупнікам елачныя кірмашы.

Паводле інфармацыі прэс-службы, жывы сімвал галоўных зімовых свят вышынёй да 1 метра ў Брэсцкай вобласці будзе каштаваць у сярэднім 39,7 тысячы рублёў, у Віцебскай — 60 тысяч, у Гомельскай — 48,4 тысячы, Гродзенскай — 50 тысяч, у Мінскай — 44,4 тысячы, у Магілёўскай вобласці — 37 тысяч рублёў.

Кошт елкі і сасны вышынёй ад 1,01 метра да 2 метраў складзе ў сярэднім па Брэстчыне 50,1 тысячы рублёў, па Віцебшчыне — 80 тысяч, па Гомельшчыне — 63 тысячы рублёў. Навагодняе дрэва ў Гродзенскай вобласці будзе каштаваць 62,3 тысячы, у Мінскай — 56 тысяч, у Магілёўскай вобласці — 54 тысячы рублёў.

Парадаваць сябе і родных дрэвам вышынёй ад 2,01 метра да 3 метраў можна будзе: у Брэсцкай вобласці — у сярэднім за 66,1 тысячы рублёў, у Віцебскай амаль удвая даражэй — за 115 тысяч, у Гомельскай — за 86 тысяч рублёў. Адпаведна, у Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях гэтыя выдаткі складуць 86, 70,4 і 83 тысячы рублёў.

Абяцаюць, што елку або сасну вышынёй ад 3,01 метра да 4 метраў можна будзе набыць толькі ў Віцебскай (180 тысяч рублёў), Гомельскай (114 тысяч), Магілёўскай (118 тысяч) і Мінскай абласцях (146,9 тысячы рублёў).

Дрэвы, вышыня якіх складзе ад 4,01 метра да 5 метраў, будуць прадаваць лясгасы Віцебскай вобласці — за 300 тысяч рублёў, Гомельскай — за 182 тысячы, Мінскай — за 241 тысячу, Магілёўскай — за 345 тысяч рублёў.

Акрамя таго, навагоднія дрэвы можна будзе набыць і ў лясніцтвах. Цэны там будуць ніжэйшыя, чым названыя.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Як нас дураць

«ПАДЗАРАБІЛІ» НА АФАРМЛЕННІ ВІЗ

У красавіку прадпрымальны мінчанін зарэгістраваў на сваё імя прыватнае гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства, якое павінна было аказваць паслугі па афармленні і рэгістрацыі анкет для падачы віз у замежнае пасольства. Аднак, як пазней установяць праваахоўнікі, з мая па верасень ніводнай анкеты так і не было зарэгістравана...

Пасля адкрыцця офіса па вуліцы Ракаўскай мінчанін наняў памочніка па працы з кліентамі, размясціў рэкламу ў сеціве і на пад'ездах дамоў, у якой, апроч іншага, абяцалася зніжка тым, хто прывядзе ў агенцтва сяброў або знаёмых. Неўзабаве пацягнуліся кліенты. Памочнік прымаў копіі дакументаў, складаў дагавор і атрымліваў аванс. Агенцтва абяцала цягам двух месяцаў зарэгістраваць анкету на пасольскім сайце, а ў выпадку невыканання абавязацельстваў — на працягу трох месяцаў вярнуць грошы. Калі ў пачатку кастрычніка кліенты ў чарговы раз, спрабуючы вярнуць свае сродкі, наведаліся ў офіс, высветлілася, што агенцтва паспешліва з'ехала. Нечаканае знікненне здзівіла нават суседзяў па офісе, перад якімі ў дырэктара і памочніка агенцтва, як высветлілася, былі матэрыяльныя абавязацельствы. У Цэнтральны РУУС г. Мінска з заявамі звярнуліся ўжо 26 пацярпелых. Агульная сума нанесенай ім шкоды — больш за 20 мільёнаў рублёў. Праваахоўнікі лічаць, што насамрэч пацярпелых можа быць нашмат больш.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

И З В Е Щ Е Н И Е

Государственное производственное объединение

«Минскстрой»

ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

объекта «Строительство многоквартирных жилых домов типовых потребительских качеств №№ 9, 11 (по генплану) со встроенно-пристроенными помещениями в жилом квартале в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Проектируемой». Жилой дом № 11 по генплану» в г. Минске,

опубликованную в газете «Звязда» 4 октября 2013 года:

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – 3 сентября 2014 г.

Генеральный директор Н.В. Милошевский

УНП 100071325

Утерянные страховые полисы серии БА №№ 0201740, 0201741, 0205015 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными.**

белагропромбанк

В соответствии с условиями договоров срочного банковского вклада (депозита) ОАО «Белагропромбанк» сообщает о снижении с 29 декабря 2013 года до 44,0% годовых размера процентной ставки по договорам срочного банковского вклада (депозита) «Забота», заключенным до 28.11.2013 года.

Телефон Контакт-центра Банка – 136
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 14.06.2013 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

■ Шануй сваё

ІМІДЖ КРАІНЫ — СКЛАДНІК ЭКСПАРТУ

5–6 снежня ў Мінску ў чацвёрты раз пройдзе міжнародны форум «Імідж Рэспублікі Беларусь». У гэты раз асноўны акцэнт будзе зроблены на выгадах, якія можна атрымаць дзякуючы развіццю іміджу гарадоў, рэгіёнаў, галін, краіны, а таксама на шляхах дасягнення гэтага развіцця і выгад. Аб чым разважаюць напярэдадні форуму, пацікавіўся карэспандэнт «Звязды».

Справа кожнага беларуса

Анатоль АКАНЦІНАЎ, генеральны дырэктар Цэнтра стратэгічнага развіцця «Маркетынгавыя сістэмы», арганізатар форуму, упэўнены, што «імідж краіны заключаецца ў кожным жыхары рэспублікі. Чым больш актыўнымі і ініцыятыўнымі мы будзем, тым большы эфект атрымаецца». Той жа думкі прытрымліваецца **Андрэй САВІНЫХ, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў:** «Няма нейкай адной арганізацыі, якая адказвае за імідж краіны. Усе адказваюць за гэта ў аднолькавай ступені. Прычым не толькі дзяржаўныя ўстановы, кампаніі, але і асобныя грамадзяне. Нават нашы паводзіны за мяжой уплываюць на гэта». Увогуле, на яго думку імідж краіны мае прыкладны характар. «Бо ў рэшце рэшт тое, як паспяхова мы прадаём свае тавары ці паслугі за мяжой, напрамую залежыць ад таго, як нас успрымаюць. Таму імідж краіны — гэта складнік рэпутацыі нашага экспарту».

Прадстаўнік МЗС звярнуў увагу на тое, што інтэрнэт становіцца асноўнай незалежнай крыніцай інфармацыі аб Беларусі. «Таму быў створаны новы інтэрнэт-праект «Беларусь. Факты». Мы хочам цікава і прыцягальна расказваць пра нашу краіну. І гэта агульная справа. Мы разглядаем гэты праект як адкрытую пляцоўку, на якую гатовы запрасіць любую грамадскую, прыватную, дзяржаўную арганізацыю, што ў стане ствараць цікавы, пазітыўны кантэнт аб нашай краіне як мінімум на дзвюх мовах — рускай і англійскай».

Дарэчы, выразіць у грашовым эквіваленце цану стварэння іміджу для Беларусі Андрэй Савіных не змог: «Сказаць дакладна, колькі грошай пойдзе на тое, каб стварыць добры імідж, цяжка. Напрыклад, імідж «Кока-колы» колькі каштуе? Вядома, мы павінны арыентавацца на канкрэтныя прагматычныя паказчыкі. Іншае пытанне, што гэта не павінна станавіцца самамэтай. Тут жа яшчэ ставіцца задача фарміравання пазітыўнага стаўлення да тавараў і паслуг нашага вырабу. І выразіць гэта «ў штуках прададзенай прадукцыі», на маю думку, праблематычна». Прэс-сакратар МЗС таксама кажа, што ідэальнага аб'екта для брэндзіравання ніколі не будзе: «На працягу развіцця трэба будзе змяняць прыярытэты і кірункі. Галоўнае ў іміджы — гэта не тое, што мы расказваем пра сябе, а тое, што бачаць і чуюць замежнікі — людзі іншага менталітэту і з іншымі сістэмамі каштоўнасцяў».

Балоты як «цікавінка»

Спецыялісты лічаць, што для замежнікаў трэба знаходзіць «цікавінкі». Казаць, што ў нас усё унікальнае — пройгрышны варыянт, бо так кажуць усе. Патрэбна нешта, чым і мы можам ганарыцца, і што для прыезджых будзе карысным і цікавым. Напрыклад, **Таццяна ТРАФІМОВІЧ, кансультант аддзела земляў і ландшафтаў упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды,** сцвярджае: «Больш за усё, на маю думку, турыстаў у нашай краіне прываблівае прырода. Экалагічны турызм вельмі актыўна развіваецца. Аднак проста прыродай таксама не прывабіш — патрэбны новыя метады. Лепш за ўсё працуе на гэта падзейны турызм, калі людзі прыязджаюць да нас на пэўнае мерапрыемства. Акрамя таго, вельмі любяць да нас ездзіць, каб паглядзець на рэдкіх птушак (напрыклад, на вяртлявую чарацянку). Таксама мы маем шмат прыгожых і ўнікальных балот. Тым больш, што яны ў Еўропе амаль знішчаны, а ў нас каля 50% засталося ў натуральным стане. Гэтым таксама трэба карыстацца як адным з козыраў».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

Заказнік «Ельня» — самае вялікае балота Еўропы.

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

■ Фінансавы выдатнік

ДВАЙНЫ ЭФЕКТ ЗАМЕЖНЫХ ІНВЕСТЫЦЫЙ

Напрыканцы года Мінэканомікі Беларусі ўсё больш увагі надае плюсам, якія мы будзем мець пры атрыманні буйных прамых замежных інвестыцый нашай краінай. Налета плануецца прыцягнуць іх у аб'ёме каля 4,5 млрд долараў. Сёння мы паспрабуем разабрацца, якім чынам гэтыя інвестыцыі «нараджаюцца» і на што яны паўплываюць.

Не толькі грошы

Пад прамымі замежнымі інвестыцыямі (ПЗІ) маюць на ўвазе ўкладанне капіталу з мэтай набыцця доўгатэрміновай эканамічнай цікавасці ў краіне, якая забяспечвае кантроль інвестара над аб'ектам размяшчэння капіталу. Такім чынам, да прамых замежных інвестыцый адносяць як першапачатковае набыццё інвестарам уласнасці за мяжой, так і ўсе наступныя здзелкі паміж інвестарам і прадпрыемствам, у якое інвестуецца капітал. Асноўнымі формамі прамых замежных інвестыцый з'яўляюцца адкрыццё за мяжой прадпрыемстваў, у тым ліку стварэнне даччыных кампаній або адкрыццё філіялаў, стварэнне сумесных прадпрыемстваў, набыццё кантрольнага пакета акцый прадпрыемстваў краіны-донара і інш.

Аналітыкі сусветнай дзелавой супольнасці ўпэўнены, што прамыя інвестыцыі надзвычай выгадныя, паколькі яны служаць каталізатарам развіцця бізнесу, падтрымліваюць інавацыі, прычым не толькі ў сферы вытворчасці тавараў і паслуг, але і ў дачыненні да новых мадэляў развіцця бізнесу, спрыяюць выхаду прадпрыемстваў на новыя рынкі, пераходу на міжнародны ўзровень якасці вытворчасці і выкарыстанню сучасных тэхналогій кіравання.

Такія інвестыцыі з'яўляюцца дадатковай крыніцай сродкаў для абнаўлення і пашырэння асноўнага капіталу, рэалізацыі інвестыцыйных праектаў і праграм, якія забяспечваюць ажыўленне і ўздым эканомікі, насычэнне ўнутранага рынку канкурэнтаздольнымі таварамі і паслугамі. Прамыя інвестыцыі дапамагаюць укараненню прагрэсіўных тэхналогій, ноу-хау, сучасных метадаў кіравання і маркетынгу; даюць станоўчы эфект з пункту гледжання засваення замежнага вопыту кіравання, маркетынгу і падрыхтоўкі кадраў. Механізм прамых інвестыцый спрыяе засваенню і замацаванню вопыту функцыянавання рынкавай эканомікі, што прыводзіць да прытоку замежнага капіталу, дае інвестару ўпэўненасць у вяртанні ўкладзеных сродкаў з дастатковым прыбыткам і паскарае фарміраванне ў краіне інвестыцыйнага клімату, спрыяльнага як для замежных, так і для айчынных інвестараў.

З дапамогай такіх інвестыцый рэальна паскорыць працэс уключэння эканомікі ў сусветную гаспадарку, дасягнуць развіцця эфектыўных інтэграцыйных працэсаў, паспрыяць выкарыстанню пераваг міжнароднага падзелу і кааперацыі працы. Акрамя гэтага, такі фінансавы інструмент будзе садзейнічаць росту занятасці і павышэнню ўзроўню даходаў насельніцтва, пашырэнню падатковай базы і паскарэнню развіцця галін і рэгіёнаў.

Плюс павелічэнне нацрэзерваў

Згадзіцеся, што 4,5 млрд долараў — даволі вялікая сума для нашай краіны. Айчынныя аналітыкі ўпэўнены, што гэта лічба рэальная. У наступным годзе толькі каля 2 млрд долараў плануецца атрымаць за кошт прыватызацыі маёмасці з удзелам замежных інвестараў. Нагадаю, што цяпер у краіне сфарміраваны пералік з 85 прадпрыемстваў. Пры гэтым 50 з іх прапануецца прыватызаваць праз механізм аўкцыёну, 35 — праз конкурс. Дзяржаўны камітэт па маёмасці падкрэслівае магчымасць у выпадку прыватызацыі гэтых 85 прадпрыемстваў забеспячэння неабходнага ўзроўню прамых замежных інвестыцый праз прыватызацыю, — паведаміў на днях **міністр эканомікі Мікалай СНАПКОЎ.**

Прыцягненне ПЗІ дае эканоміцы двайны эфект, удакладняе пазіцыю эканамістаў міністр: «Па-першае — гэта новыя тэхналогіі і адпаведна павышэнне канкурэнтаздольнасці эканомікі краіны, другое — балансіроўка плацежнага балансу», — адзначыў ён.

Прыцягненне адпаведнага аб'ёму прамых замежных інвестыцый дазволіць збалансаваць плацежны баланс і нарасціць золатавалютныя рэзервы (ЗВР) да ўзроўню 8,5 млрд долараў. Гэта з'яўляецца найважнейшым псіхалагічным фактарам як для насельніцтва з пункту гледжання дэвальвацыйных чаканняў, так і для інвестара з пункту гледжання ўваходжання ў нашу краіну, дзе захоўваецца стабільная фінансавая сітуацыя, лічаць у Мінэканомікі краіны.

На пачатак лістапада ЗВР Беларусі ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду склаў 6,8131 млрд долараў у эквіваленце.

***

Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звярнуцца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефоне 8 017 292 38 02.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Будзем здаровыя!

ПЛАСТЫЧНАЯ ХІРУРГІЯ НА НОВЫХ ТЭХНАЛОГІЯХ

38 млрд рублёў было вылучана па праграме мінімізацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС для рэканструкцыі і тэхнічнага абсталявання хірургічнага блока першага корпуса Гомельскага абласнога клінічнага анкалагічнага дыспансера.

Загадчык аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі Сяргей МУРЫЧАЎ і анестэзіёлаг Аксана ДЗЯНІСАВА ў новай аперацыйнай.

За два гады былы паліклінічны корпус па вуліцы Цыялкоўскага ў Гомелі ператварыўся ў самы сучасны аперацыйны блок. Галоўны ўрач Гомельскага абласнога клінічнага анкалагічнага дыспансера Таццяна Прыгожая расказвае, што тут аперыруюцца пухліны малочнай і шчытападобнай залоз, галаўнога мозга і іншыя. Цяпер магчымасці пашырацца значна:

— Тут шырока разгорнецца пластычная хірургія. Самае галоўнае, што ў нас ёсць сертыфікаваныя падрыхтаваныя спецыялісты, якія ўжо могуць пачынаць працаваць у самых сучасных умовах. У першую чаргу размова ідзе пра рэканструкцыю пасля анкалагічных аперацый. Гэта патрэбна таксама вялікай колькасці жанчын, якім была выдалена малочная залоза: яны ж хочуць выглядаць прыгожымі і здаровымі. Акрамя таго, будуць увасабляцца новыя тэхналогіі, якія звязаны з прымяненнем мікрахірургічнай і лапараскапічнай тэхнікі. Раней у гэтым корпусе выконвалася да 3 тысяч аперацый у год. Пасля рэканструкцыі мы плануем выконваць іх больш за 5 тысяч. Зараз тут лечыцца даволі шмат замежных грамадзян. Думаю, з уводам адноўленага корпуса іх стане значна больш. Сёння ўжо ёсць чарга на правядзенне аперацый жыхарам Украіны і Расіі, — кажа Таццяна Прыгожая.

Анестэзіялагічнае абсталяванне, якое ўсталявана ў адноўленым трохпавярховым аперацыйным блоку, дазволіць праводзіць яшчэ больш дасканалую падрыхтоўку пацыента да аперацыі. Між іншым, вялікая частка абсталявання — беларускай вытворчасці. У прыватнасці — наркозна-дыхальныя апараты і аперацыйныя сталы фірмы "Інтэграл". Але ж будзе выкарыстоўвацца і замежнае абсталяванне. Усё размешчана побач і з максімальнай зручнасцю — як для хворых, так і для ўрачоў, якія робяць аперацыю.

— Пры неабходнасці тут жа праводзяцца лабараторныя даследаванні, наладжана сістэма перакладвання хворага. Яго будуць уводзіць у наркоз у пакоі анестэзіёлага, а потым у аперацыйным пакоі перакладваць на аперацыйны стол. Гэта павінна значна павялічыць прапускную здольнасць аперацыйных і колькасць саміх аперацый. Зараз поўнасцю рэканструяваны не толькі аперацыйныя, але і рэанімацыйнае аддзяленне, аддзяленне хірургіі аднаго дня і ўсе дапаможныя службы.

Праект рэалізаваны на аснове канцэпцыі развіцця абласнога клінічнага анкалагічнага дыспансера, распрацаванай Міністэрствам аховы здароўя і Гомельскім аблвыканкамам. На першым этапе мадэрнізацыі, які завяршыўся ў 2009 годзе, былі выкананы работы па рэканструкцыі аддзялення хіміятэрапіі.

Завершыцца глабальная рэканструкцыя прывядзеннем у належны стан палатнага корпуса, на што патрэбна значна менш сродкаў, чым было ўжо затрачана. Сёння на Гомельшчыне налічваецца 45 тысяч хворых на анкалагічныя захворванні. На ўлік штогод становяцца да 9 тысяч новых. Між тым, сучаснае абсталяванне дазволіць павялічыць колькасць складаных і высокатэхналагічных аперацый з чаканым зніжэннем смяротнасці ад анкалагічнай паталогіі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара

■ Паэма—юбілярка

«НОВАЯ ЗЯМЛЯ» Ў ЭКСПАНАТАХ

Магілёўскія школьнікі знаёмяцца з творам Якуба Коласа «Новая зямля» на экскурсіях у музеі.



Мастак Васіль ШАРАНГОВІЧ.

Выстава абласнога краязнаўчага музея «Зямля — аснова ўсёй Айчыны», якая нядаўна адкрылася, прысвечана 90-годдзю коласаўскай паэмы. Большасць экспанатаў прадстаўлена фондамі мінскага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Да часоў напісання паэмы, а таксама дзяцінства і юнацтва класіка вяртаюць карціны беларускага мастака Уладзіміра Сулкоўскага. Нібы жывыя, перад вачыма паўстаюць знаёмыя пейзажы з яго паэмы — тыя самыя «елка ў пары з хваіною», «крынічкі вузенькае ложа». Яшчэ адзін выдатны мастак Беларусі Васіль Шаранговіч намаляваў больш за 90 ілюстрацый, якія ўвайшлі ў юбілейнае выданне паэмы «Новая зямля» 2002 года. Дарэчы, на выставе можна ўбачыць некалькі розных выданняў паэмы, у тым ліку і прыжыццёвых. Напрыклад, ёсць кніга, датаваная 1925 годам. А таксама яе варыянт для сляпых, дзе тэкст падаецца рэльефна-кропкавым шрыфтам Брайля.

У музеі прадстаўлена этнаграфічная кампазіцыя і арыгінал атэстата Мікалая Мікіціна, выдадзенага ў 1925 годзе. Мікіцін скончыў вышэйшыя курсы беларусазнаўства, дзе выкладаў Якуб Колас: на афіцыйнай паперы можна пабачыць яго подпіс. Па словах старшага навуковага супрацоўніка музея Аляксандры Бураковай, гэты экспанат музей выкупіў у аднаго з мясцовых калекцыянераў.

Яшчэ адзін раздзел выставы прысвечаны перапісцы пісьменніка з выхаванцамі Чавускага дзіцячага дома. Захаваўся ліст маленькага хлопчыка Валодзі Бяляева, які звярнуўся да Коласа з прапановай выслаць яму якую-небудзь цікавую кніжку, за якую ён нават... абяцае заплаціць. «Пасля вайны Якуб Колас шмат каму дапамагаў, — кажа Аляксандра Буракова. — Сярод тых, хто атрымаў гэтую дапамогу, вядомы скульптар Заір Азгур. Ён быў вельмі таленавіты, але не меў грошай, каб вучыцца. І Якуб Колас даў яму іх. Азгур потым аддзячыў свайму дабрадзею — зрабіў помнік на магіле яго жонкі, якая была пахавана на вайсковых могілках у Мінску ў 1945 годзе. А ў 1972 у Мінску на плошчы Якуба Коласа быў усталяваны помнік пісьменніку, зроблены Азгурам». Не менш цікавы экспанат — драўляны бюст Якуба Коласа. Калі пісьменніку споўнілася 70 гадоў, адзін з выхаванцаў Чавускага дзіцячага дома зрабіў яму такі падарунак».

Ёсць здымак 1927 года, дзе Якуб Колас сярод выкладчыкаў і навучэнцаў Горацкай сельгасакадэміі. Некалькі разоў пісьменнік наведваўся і ў Магілёў. У 1938 годзе ён прысутнічаў на прэм'еры пастаноўкі сваёй п'есы «У пушчах Палесся» па матывах аповесці «Дрыгва» ў Магілёўскім драмтэатры.

Найбольшую цікавасць выстава выклікае ў школьнікаў, якія маюць магчымасць замацаваць атрыманыя на ўроках беларускай літаратуры веды. Чула, як пасля экскурсіі малыя дзяліліся ўражаннямі ад убачанага і пачутага. Адзін скептычна заявіў: «Так сабе выстава». На што яго таварыш з абурэннем парыраваў: «Гэта самы цікавы расповед, які я толькі чуў».

— Шмат каму было цікава даведацца пра тое, як Колас атрымаў свой першы ганарар. Калі ён, зусім яшчэ малы, прачытаў бацьку адзін са сваіх першых вершаў — «Вясна», той быў настолькі ўражаны, што даў сыну вялікія на той час грошы — цэлы рубель.

Застаецца дадаць, што акунуцца ў свет беларускай паэзіі вялікага песняра можна будзе яшчэ на працягу месяца.

Нэлі ЗІГУЛЯ

ПРОСТА СТАЛА ЯГО ШКАДА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тамара Віктараўна і Пётр Антонавіч выхавалі траіх дзяцей, такіх жа працавітых і спагадлівых, як і яны самі. І, вядома ж, тыя падтрымалі маці і бацьку ў іх адказным рашэнні прыняць у сям'ю чужога чалавека. Дзеці і ўнукі Захарэвічаў, калі наведваюць бацькоўскі дом, заўсёды прывозяць гасцінцы і падарункі дзядулю Міхаілу Пятровічу, які стаў для іх родным. А самі гаспадары надзвычай прывязаліся да яго і лічаць паўнапраўным членам дружнай сям'і.

Дадам, што Міхаіл Пятровіч афіцыйна прыняты на надомнае сацыяльнае абслугоўванне з аказаннем сацыяльна-бытавых паслуг ва ўмовах пражывання ў сям'і.

Асноўнымі задачамі прыёмнай сям'і ў цэнтры лічаць стварэнне адпаведнага мікраклімату для пажылога чалавека, яго псіхалагічную рэабілітацыю. Гэтая форма работы дазваляе вырашаць праблему жыццеўладкавання састарэлых, забяспечыць ім належны догляд, устараніць пачуццё адзіноты, падтрымлівае традыцыі сямейнага клопату аб слабейшых.

— Жыццё ў сучасных умовах патрабуе ўдасканалення сістэмы сацыяльнага абслугоўвання і развіцця новых паслуг, галоўная мэта якіх — дапамога і догляд тых, хто ў гэтым мае патрэбу, — сцвярджае намеснік дырэктара тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання Тамара Манюхіна. — Многія формы сацыяльнай работы патрабуюць не толькі ведаў і добрасумленнага выканання сваіх абавязкаў, але і асаблівых чалавечых якасцяў, неабыякавасці да чужога лёсу. Таму і гавораць, што сацыяльны работнік — гэта асаблівая прафесія. Вось і ў нашым цэнтры арганізавана работа "Прыёмнай сям'і" дзякуючы высакароднасці сямейнай пары Захарэвічаў — Тамары Віктараўны і Пятра Антонавіча.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

■ Молада — не зелена

ЗАЎТРА ПАЧЫНАЕЦЦА СЁННЯ

Пасадкай алеі ў гонар 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (70 туй) пакінулі ў Ваўкавыску памяць пра сябе ўдзельнікі ўжо традыцыйнага, пятага па ліку злёту старшакурснікаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў Гродзеншчыны. Ён праводзіцца па ініцыятыве абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» пры падтрымцы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, галіновых прафсаюзаў і абласнога камітэта «БРСМ».

— Галоўная ідэя злёту ў тым, каб моладзь, якая заўтра прыйдзе ў працоўныя калектывы, на свае вочы ўбачыла рэаліі сённяшняга жыцця. Праблема замацавання выпускнікоў навучальных устаноў на сваіх першых рабочых месцах, асабліва ў аграрнай сферы, застаецца даволі вострай. Але, разам з тым, шмат і станоўчых прыкладаў, калі маладыя спецыялісты не абмяжоўваюцца абавязковым тэрмінам адпрацоўкі, а застаюцца ў гэтым калектыве і надалей, — зазначае **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Ігар ЖУК.**

У тым, што шмат дзе так і адбываецца, удзельнікі злёту пераканаліся на сельгаспрадпрыемствах «Зара і К», «Няверавічы», у таварыстве «Беллакт», «Краснасельскбудматэрыялы», Ваўкавыскай цэнтральнай раённай бальніцы і ў іншых арганізацыях.

— Маладым спецыялістам, якія прыязджаюць у аграрадкі, іншыя сельскія населеныя пункты, прадастаўляецца добраўпарадкаванае жыллё. У кожнай гаспадарцы ёсць інтэрнат. А ў Ваўкавыску з гэтым наогул няма праблем: добраўпарадкаваны інтэрнат прадастаўляем усім ахвотным па хадайніцтве любой арганізацыі. У наступным годзе плануем узяць пад свой патранаж два ведамасныя інтэрнаты, зрабіўшы там больш камфортныя ўмовы — па тыпе маласямейкі, — паведаміў **старшыня Ваўкавыскага райвыканкама Міхаіл СІЦЬКО.**

Пры гэтым, зразумела, малады спецыяліст і калектыў — гэта, так бы мовіць, заўсёды вуліца з двухбаковым рухам.

— Многія лічаць, што, атрымаўшы дыплом, яны ўжо спецыялісты. Аднак сёння, калі поспех немагчымы без укаранення новых тэхналогій, нельга спыняцца ў сваёй прафесійнай адукацыі. Трэба не толькі валодаць камп'ютарам, іншымі тэхнічнымі сродкамі і ўмець успрымаць інфармацыю са шматлікіх крыніц, але і прымяняць яе на практыцы, — лічыць **рэктар Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, старшыня абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Вітольд ПЕСЦІС.**

Уласным вопытам падзяліліся з цяперашнімі старшакурснікамі нядаўнія студэнты, а сёння маладыя спецыялісты.

Ігар БАГДАНАЎ, намеснік дырэктара КСУП «Зара і К» Ваўкавыскага раёна абвяргае стэрэатып, што, прыйшоўшы ў сельскую гаспадарку, ужо не маеш часу на адпачынак:

— Так, праца аграрніка цяжкая, у найбольш напружаныя перыяды сапраўды бывае праблематычна з выхаднымі. Аднак сёлета ў нас ужо былі паездкі ў Мінск, Жыровічы, Мір, Нясвіж. Таксама наведвалі Кіеў, Ужгарад, Санкт-Пецярбург ... Не толькі напружана працуем, але і цікава адпачываем. Пры гэтым маладому спецыялісту вельмі важна разумець, што ёсць не толькі абавязкі перад ім з боку дзяржавы, прадпрыемства, але і ён павінен нешта зрабіць для калектыву, куды прыйшоў, праявіць сябе. Кіраўніцтва гэта ўбачыць і будзе ўсяляк заахвочваць такога работніка — і зарплатай, і паляпшэннем жыллёвых умоў.

Андрэй КРАСОЎСКІ, начальнік малочнатаварнага комплексу СВК «Дэмбрава» Шчучынскага раёна два гады таму закончыў Гродзенскі аграрны ўніверсітэт, а ўжо ўзначальвае адно з перадавых вытворчых падраздзяленняў гаспадаркі, дзе працуе больш за 40 чалавек.

— Буду на гэтай зямлі расціць дзяцей, працаваць і дабівацца поспеху. Дарэчы, разам са мной працуюць яшчэ два маладыя спецыялісты. Яны таксама задаволены работай, зарплатай і умовамі жыцця, — сказаў Андрэй.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Ваўкавыскі раён

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

28 ЛІСТАПАДА 2013 г.
ЧАЦВЕР
№ 24 (15733)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Каця ВОЛКАВА:

«Я ВЕДАЮ СМАК САПРАЎДНАГА ШОУ-БІЗНЕСУ»

Да эпатажнасці можна ставіцца па-рознаму, але яна, эпатажнасць, працуе. Каця Волкава даказвае на ўласным прыкладзе. Паспрабаваўшы свае сілы ў праектах «Акадэмія талентаў-2», «Украіна мае талент-5», яна вырашыла скарыць шоу «Хачу ў ВІА Гру». Хоць у лік новых салістак і не трапіла, але пра сябе заявіла. І няхай шоу-бізнес слязам не верыць, аднак калі вам кажа «Так!» сам Канстанцін Меладзэ, то з такім вердыктам не паспрачаешся. Падчас сустрэчы Каця расказала, як змянілася яе жыццё пасля шоу, чым яна збіраецца парадаваць прыхільнікаў і чаго ёй не хапае для шчасця.

— Як правіла, жаданне стаць знакамітым абумоўлена нейкімі прычынамі. Якімі былі твае?

— Пачалося ўсё, мабыць, з таго, што гадоў з пяці я стаяла перад люстэркам і спявала песні Джэніфер Лопес, якая тады была папулярнай. Альбо выступала перад суседзямі ў двары: сядзяць бабулі, дзядулі на лавачцы, а я стаю і спяваю «Малодшы лейтэнант» Алегравай. Ніколі не саромелася выступаць, і ўгаворваць мяне не даводзілася. Мама вельмі хацела аддаць мяне на танцы альбо ў музычную школу, а там сказалі, быццам у мяне адсутнічае слых. Таму, можна сказаць, я з дзяцінства марыла быць артысткай, але паўтарыла лёс тых, каму пры першых спробах адмаўляюць і выстаўляюць за дзверы. І так да той пары, пакуль адны з іх не адчыняюцца...

— І ты вырашыла паказаць свой творчы запал на шоу «Хачу ў ВІА Гру»?

— Шоу «Хачу ў ВІА Гру» — і ёсць тыя самыя дзверы, якія адчыніліся перада мной. Хоць, калі казаць пра сам гурт «ВІА Гра», то тут я зноў апынулася за парогам. Аднак вельмі важна тое, што спачатку мяне ўпусцілі, дазволілі паказаць сябе і потым падказалі, куды мне рухацца далей. На праекце я зразумела: па-першае, я — прафесіянал. Але да шоу мне ніхто ў нас пра гэта не казаў услых. На многіх кастынгах я чула, быццам мне не хапае прафесіяналізму. А потым я трапіла ў шоу, і калі там вакалісты і харэографы з іменем сказалі мне: «Ты класная! У цябе ўсё атрымліваецца!», то дадому я вярнулася абсалютна ўпэўненым у сваіх сілах чалавекам. Зараз мяне ўжо нішто не спужае. Упэўненасць — гэта наогул 90 працэнтаў поспеху. Па-другое, я пакаштавала на смак сапраўдны шоу-бізнес.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

РазМЕРКАВАННЕ

Ён прыйшоў і... «Усе У Сталі»!

У гэтым горадзе ёсць тое, чаго пакуль няма ў Гомелі і ў Мінску... Прынамсі, так сказаў нам пра Жлобін супрацоўнік Беларускага металургічнага завода Андрэй Ананчыкаў, маючы на ўвазе аквапарк. Два гады размеркавання, якія некаторым маладым спецыялістам здаюцца вечнасцю, Андрэй ужо тры месяцы таму адпрацаваў і кажа, што сыходзіць нікуды не збіраецца. Хлопец пагадзіўся расказаць журналістам «Чырвонкі» ўсю праўду пра будні «суровых металургаў», паказаў «халадзільнік», дзе мінімальная тэмпература металу — больш за 400 градусаў са знакам «плюс». А яшчэ распавёў пра другі бок свайго жыцця: захапленне КВЗ, работу тамадой і... Дзедам Марозам.

Гарачы метал, бяссонныя ночы...

...«Тут проста «Маямі»!» — думала я, стоячы за некалькі метраў ад расплаўленага металу ў спецыяльнай куртцы, якую выдалі для паходу ў цэх, і ў касцы. У гэты час гарачая чырвоная стужка павольна плыла па 120-метровым «халадзільніку», амаль тут жа астываючы і ператвараючыся ў арматуру. Дзяўчатам, відавочна, патрэбна падрабязна растлумачваць, што ж тут адбываецца.

— Працую аператарам паста кіравання 320-га стану гарачай пракаткі сортапракатнага цэха, а калі прасцей, то мая галоўная задача — сядзець за пультам кіравання і назіраць за ахалоджваннем і транспарціроўкай арматуры. Метал трэба ахаладзіць, парэзаць і запакаваць, — распавядае Андрэй.

Здаецца, яго словы паціху дапамагаюць «уліцца» ў сутнасць працэсу. Аказваецца, ёмкае і незразумелае старонняму чалавеку слова «пульт кіравання» — гэта спецыяльнае невялікае памяшканне, з якога нібы на далоні відаць адпаведныя ўчасткі цэха. Пакуль канвеер працуе і шуміць, на маніторы камп'ютара аператар бачыць ход і вынікі ўсяго працэсу.

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Трыумф лепшых

«СТУДЭНТ ГОДА — 2013»: САМА НЕПАСРЭДНАСЦЬ!

Актавая зала Камандна-інжынернага інстытута МНС уся бурліла, уздымалася хвалямі з рознакаляровых паветраных шароў, шалікаў, плакатаў, то тут, то там узрывалася крычалкамі. Радасныя дрыжыкі, пэўна, бегалі па спінах усіх, хто сабраўся, каб даведацца, хто ж стане ўладальнікам тытула «Студэнт года — 2013».

Пераможца Марыя Філімонава (злева) з групай падтрымкі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Дайсці да фіналу — ужо перамога!

Да заключнага этапа рэспубліканскага конкурсу дайшлі восем чалавек. Лепшыя з лепшых, гонар сваіх універсітэтаў, самыя разумныя і таленавітыя студэнты з усёй краіны. Яны выйшлі на сцэну пад урачыстую музыку і апладысменты — прыгожыя, усмешлівыя, і ў кожнага ў вачах ззяў настрой на перамогу. Зрэшты, як адзначыў міністр адукацыі Сяргей Маскевіч, які адкрываў мерапрыемства, гэтыя хлопцы і дзяўчаты ўжо сталі пераможцамі, прайшоўшы ў фінал. Бо то была задача не з лёгкіх: кожны канкурсант павінен мець высокія паказчыкі ў вучобе (сярэдні бал не ніжэйшы за восем), быць актывістам Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, удзельнічаць у грамадскім жыцці і органах самакіравання ў сваіх ВНУ.

У першым іспыце «Візітная картка» канкурсантам адводзілася тры хвіліны для таго, каб прэзентаваць сябе. Студэнтка Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Тацяна Лучыц яскрава праявіла сябе ў розных танцах — цыганскіх, усходніх і беларускіх. Пяцікурсніца Беларуска-Расійскага ўніверсітэта з Магілёва Марыя Філімонава за тры хвіліны паспела развесяліць гледачоў некалькімі эпізодамі з КВЗ, прачытаць рэп і нават паказаць міні-спектакль. А студэнт БДУІР Сяргей Казловіч прызнаўся, што за чатыры гады студэнцкага жыцця яркіх момантаў у яго набралася на цэлую кнігу, а то і на фільм. Хто ведае, можа, у хуткім часе і сапраўды будзе магчымасць пабачыць такую кінастужку: Сяргей працуе на тэлеканале АНТ, а таксама выпускае праграму «Заліковы тыдзень» на студэнцкім тэлебачанні. Апроч гэтага, удзельнікі выступілі з «жывымі» лялькамі і шахматамі, было тут і пластычна-неонавае шоу, і пранікнёны маналог адной з канкурсантак, адрасаваны яе будучай дачцэ, і нават «пажарная кухня» з сапраўднымі прадуктамі харчавання, выратавальнікамі ў форме, спевамі і танцамі...

Асабістае дасье пераможцы:

Марыя Філімонава — студэнтка 5 курса інжынерна-эканамічнага факультэта Беларуска-Расійскага ўніверсітэта, спецыяльнасць «Камерцыйная дзейнасць».

Марыя гуляе ў зборнай КВЗ універсітэта «БРУклін», з'яўляецца чэмпіёнам Міжгалактычнай лігі КВЗ, тройчы «Міс гульні» Міжрэгіянальнай лігі КВЗ «Палессе». Выступае ва ўзорным тэатры «Рэха» пад кіраўніцтвам Наталлі Дурэйка. Захапляецца музыкай (хэдлайнер прэзентацыі альбома групы «Нестандартны варыянт», удзельнік РЭП-фестывалю «Hiphopium»).

Кандыдат у майстры спорту па настольным тэнісе. На факультэце Марыя прапагандуе моду на здаровы лад жыцця.

Акрамя таго, дзяўчына займаецца навуковай работай, прымала ўдзел у студэнцкай навукова-даследчай канферэнцыі «Інавацыі ў эканоміцы», мае навуковыя публікацыі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
28 11 2013 г.

Напішу на «мыла» рэктару

УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ ПАЧЫНАЕЦЦА... СЁННЯ

У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі ўпэўнены: вынікі апошняй прыёмнай кампаніі, якім могуць пазайздросціць многія ВНУ, — зусім не падстава для таго, каб спачываць на лаўрах, таму новую ўступную кампанію трэба распачынаць літаральна па «гарачых слядах», пакуль патэнцыяльныя абітурыенты яшчэ вызначаюцца са сваім прафесійным выбарам.

Экскурсія па закрытых месцах

— А наша задача — дапамагчы моладзі зрабіць правільны выбар, — падкрэслівае рэктар універсітэта Міхаіл Батура, — таму запрашаем усіх на абноўлены сайт «Электронны абітурыент». Наш сайт — прынцыпова новы крок ва ўзаемадзеянні са студэнтамі. Фактычна гэта платформа для наладжвання жывых стасункаў і дыялогу. Сайт мае два віды доступу: звычайны — для незарэгістраваных карыстальнікаў і пашыраны — для карыстальнікаў, што прайшлі рэгістрацыю. Апошнія змогуць праз сайт, як у сацыяльных сетках, асабіста пагутарыць з загадчыкамі кафедраў, дэканамі факультэтаў і нават з рэктарам, задаць ім пытанні і атрымаць адказы, так бы мовіць, з самых першых рук.

Таксама на сайце будуць ладзіцца відэаканферэнцыі па ўсіх нюансах паступлення ў БДУІР, а ўся новая інфармацыя, што тычыцца прыёму, тут жа будзе рассылацца ўсім актыўным яго карыстальнікам. Акрамя таго, у абітурыентаў будзе доступ да адкрытых відэаурокаў з разборам задач па фізіцы і матэматыцы. **А ў Дзень закрытых дзвярэй *(ён называецца менавіта так)*, які плануецца правесці ў красавіку, абітурыенты змогуць здзейсніць на сайце «Электронны абітурыент» віртуальную экскурсію па самых закрытых месцах ва ўніверсітэце, куды ў звычайны дзень трапіць складана, або немагчыма (напрыклад, зазірнуць у кабінет рэктара або ў навукова-даследчыя лабараторыі).**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Планшэт і... месца ў інтэрнаце

Міхаіл Батура паведаміў, што 22 лістапада на сайце «Электронны абітурыент» стартаваў інтэрнэт-конкурс «Хачу стаць студэнтам БДУІР». Конкурс складаецца з пяці этапаў. Першы этап — творчы. Абітурыентам прапануюць напісаць эсэ на тэму «Чаму я хачу стаць студэнтам БДУІР?» Летась аналагічны конкурс прайшоў на «ўра». Нягледзячы на тое, што ў БДУІР рыхтуюць не філолагаў ці журналістаў, а будучую тэхнічную эліту краіны, моладзь аказалася на вышыні, а некаторыя ўдзельнікі дасылалі эсэ нават у вершаванай форме.

Другі этап — гістарычны, прымеркаваны да 50-годдзя БДУІР. Яго ўдзельнікам будуць прапанаваны пытанні з гісторыі ўніверсітэта. Трэці этап — рэкламны: перад абітурыентамі паставяць задачу стварыць камп'ютарны плакат на зададзены слоган, і журы вельмі спадзяецца на крэатыўнасць маладых людзей. Чацвёрты — інтэлектуальны (на веданне абітурыентамі фізікі, матэматыкі і інфарматыкі). І пяты — прафарыентацыйны (спецыяльны тэст). Далучыцца да ўдзелу ў конкурсе можна на любым этапе. Усе яны ацэньваюцца асобна, па 10-бальнай шкале. Пераможцаў і прызёраў чакаюць каштоўныя падарункі — планшэт, тэлефон і электронная кніга. А іншагароднім пераможцам і прызёрам конкурсу гарантуюць таксама (пры ўмове паступлення) месца ў студэнцкім інтэрнаце.

— Задача нашых конкурсаў — мабілізаваць маладых людзей: прымусіць іх думаць пра БДУІР, вывучаць, высвятляць, цікавіцца і рыхтавацца, — тлумачыць рэктар. — Але цэнтралізаванае тэсціраванне — гэта зусім іншая гісторыя. Ніякага дачынення да цэнтралізаваных выпрабаванняў мы не маем. І стаць студэнтам БДУІР зможа толькі абітурыент, які набярэ на тэсціраванні патрэбную колькасць балаў…

Дарэчы, пераможца папярэдняга конкурсу эсэ «Мая мара — БДУІР» Марыя Марчук сваю мару ўвасобіла ў жыццё — стала студэнткай БДУІР. Набраўшы ў суме за тры сертыфікаты і сярэдні бал дакумента аб адукацыі 386 балаў, Маша паступіла на самую запатрабаваную ў абітурыентаў спецыяльнасць «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» факультэта камп'ютарных сістэм і сетак. Між іншым, паўпрахадны бал на гэтую спецыяльнасць склаў 375 балаў!

А прызёры конкурсу Раман Сіткевіч і Мікіта Чайчыц таксама сталі студэнтамі бюджэтнай формы навучання. Раман абраў спецыяльнасць «Электронныя і інфармацыйна-кіруючыя сістэмы фізічных установак», дзе рыхтуюць спецыялістаў для першай беларускай АЭС, а Мікіта — перспектыўную спецыяльнасць «Праграмуемыя мабільныя сістэмы». Абедзве гэтыя спецыяльнасці былі адкрыты толькі ў гэтым годзе, і прыём на іх ажыццяўляўся ўпершыню.

На меншае — не згодны…

Што тычыцца вынікаў апошняй прыёмнай кампаніі, то яна мела ў БДУІР шэраг адметнасцяў. Па-першае, у параўнанні з 2012 годам істотна выраслі прахадныя балы на некаторыя спецыяльнасці (на 55–62 балы). Па-другое, пералік спецыяльнасцяў тэхніка-тэхналагічнага профілю, якія маглі ўказваць абітурыенты ў парадку прыярытэтаў, павялічыўся з пяці да сямі. Больш як 50% абітурыентаў скарысталіся прадастаўленай магчымасцю, але больш як 20% абітурыентаў замест магчымых сямі ўказалі толькі адну — дзве спецыяльнасці, што сведчыць аб мэтанакіраванасці іх выбару.

— Зразумела, што колькасць балаў у сертыфікатах гэтых маладых людзей дазваляла ім быць упэўненымі ў сваім паступленні. Яны маглі дазволіць сабе рызыкаваць, хоць рызыка была, вядома, умоўнай, паколькі аўтаматызаваная сістэма прыёму заяў і залічэння абітурыентаў не дазволіць застацца за бортам уладальнікам высокіх балаў у сертыфікатах. А ўвогуле з кола залічаных на першы курс дзённай бюджэтнай формы навучання больш як 63% мелі ў суме за тры сертыфікаты і дакумент аб адукацыі 300 балаў і больш, — заўважыў Міхаіл Батура.

Вялікай папулярнасцю ў абітурыентаў гэтага года карысталася новая спецыяльнасць «Праграмуемыя мабільныя сістэмы». Конкурс на яе перавысіў 4 чалавекі на месца, а прахадны бал склаў 341. Сёння ў БДУІР працуюць над адкрыццём яшчэ адной новай спецыяльнасці «Інфармацыйныя сістэмы аналізу і кіравання бізнесам» і вельмі спадзяюцца, што паспеюць атрымаць дазвол правесці на яе набор да пачатку прыёмнай кампаніі.

Дарэчы, традыцыйны дзень адкрытых дзвярэй — з канцэртнай праграмай, прэзентацыяй факультэтаў, выставай навуковых распрацовак — пройдзе ў БДУІР 27 сакавіка. Але, пачынаючы са снежня, тут па суботах будуць ладзіцца яшчэ і Дні абітурыента на факультэтах. Так, 7 снежня ўсіх ахвотных запрашае ў госці факультэт камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР. Маладыя людзі змогуць пабываць на лекцыях, у лабараторыях, пагутарыць са студэнтамі і выкладчыкамі. Такім чынам, у абітурыентаў будзе ўнікальная магчымасць на працягу навучальнага года наведаць усе факультэты і кафедры ўніверсітэта.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«СТУДЭНТ ГОДА — 2013»: САМА НЕПАСРЭДНАСЦЬ!

ТЭМЫ, ЯКІЯ ХВАЛЮЮЦЬ КОЖНАГА

Другім выпрабаваннем для ўдзельнікаў стаў конкурс прамоўніцкага майстэрства. Тут ім сапраўды давялося панервавацца! Вядучыя (пераможца і фіналіст леташняга конкурсу Ксенія Шынгірэй і Аляксандр Козыраў) абвясцілі агульную для ўсіх тэму, на якую трэба было аргументавана выказацца, — беражлівасць. Затым кожны падыходзіў і выбіраў картку, на адваротным баку якой заданне было больш канкрэтызаваным. Дваццаць секунд на падрыхтоўку — і калі ласка, прадстаўляйце свае тэзісы публіцы! Не ўсе ўдзельнікі змаглі зладжана і лагічна пабудаваць свае прамовы. Але варта адзначыць, што студэнтка БНТУ Ірына Марцінкевіч пачала выступленне, прысвечанае клопату пра бацькоў, без падрыхтоўкі. А адным з самых вобразных і аргументаваных стала выказванне «гаспадыні» конкурсу, студэнткі Камандна-інжынернага інстытута Настассі Луферчык. Разважаючы пра важнасць беражлівага стаўлення да ведаў, дзяўчына параўнала жыццё чалавека з жыццём дрэва: чалавек, як і дрэўца, на пачатку свайго жыцця слабы і безабаронны; але з часам ён сталее, набывае гэтыя самыя веды, што становяцца для яго своеасаблівым «карэннем», пры дапамозе якога можна моцна трымацца на зямлі.

Адным з найцікавейшых стаў конкурс студэнцкіх праектаў. Студэнтка Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Валерыя Насікан звярнула ўвагу на важнасць сацыяльнай адаптацыі дзяцей-сірот. Пры дапамозе дзяўчатак з дзіцячага дома яна паказала дэфіле касцюмаў і прычосак, што яны зрабілі разам у дызайн-студыі «Крок у будучыню», створанай студэнткай. Сяргей Казловіч прэзентаваў цыкл кароткаметражных фільмаў-інтэрв'ю з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны «Ветэраны: каб памяталі». А навучэнка Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Алеся Гапановіч прадставіла праект «Горыч непражытых вёснаў», прысвечаны памяці дзяцей, якія загінулі падчас вайны.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

«І Ў МНС ПАТРЭБНА ПРЫГАЖОСЦЬ...»

Да намінацыі «Спартыўны мікс» фіналісты таксама падышлі творча і рознабакова. Сярод «відаў спорту» можна было пабачыць «фітнес сучасных дзяўчат падчас шопінгу» ад Алесі Гапановіч і сцэнку пра футбол, пакладзеную на сцэнарый шэкспіраўскай пьесы «Рамэа і Джульета» (уявіць вельмі цяжка, але выглядала гэта сапраўды крэатыўна, весела, а месцамі нават лірычна) ад курсанта Гомельскага інжынернага інстытута МНС Кірыла Чупругіна. Але ў выніку яго будучая калега, студэнтка мінскага Камандна-інжынернага інстытута Настасся Луферчык, усіх пераканала ў тым, што «мы здольныя прывесці Алімпіяду ў Беларусь».

Пасля фізічнай актыўнасці прэтэндэнтам на званне студэнта года прапанавалі праявіць сябе ў творчасці. Амаль нікога не здзівілі танцы, спевы і нават фокусы. Адметнымі былі хіба што песняроўская «Касіў Ясь канюшыну», якую праспяваў Сяргей Казловіч з бэк-вакалісткамі ў вышыванках у спалучэнні са стылізацыяй пад рок. Ды расчуліла кампазіцыя ўласнага сачынення Настассі Луферчык пра расчараванне ў каханні. З песні вынікала, што хлопец, які не захацеў стаць пажарным, не можа звацца мужчынам. Таму гераіня пакінула яго і сама пайшла служыць, аргументуючы гэта тым, што «І ў МНС патрэбна прыгажосць, усмешкі, зачараванне…». Але ж найбольшае ўражанне на гледачоў зрабіла пастаноўка ў вершах «Калядны базар 1945 года», якую прадставіла магіляўчанка Марыя Філімонава.

Упершыню за трохгадовую гісторыю конкурсу, акрамя дадатковай анлайн-намінацыі і першага месца, з'явіліся другая і трэцяя пазіцыі.

Трэцяе месца дасталася студэнту Гомельскага камандна-інжынернага інстытута Кірылу ЧУПРУГІНУ.

«Я БЫЛА ТАКАЯ, ЯКАЯ ЁСЦЬ»

І вось настаў час, калі ўсе выпрабаванні пройдзены і засталося толькі дачакацца вынікаў журы. Хто ж стане лепшым студэнтам года? Напачатку паведамілі вынікі інтэрнэт-галасавання за відэаролікі, прадстаўленыя на конкурс кожным з удзельнікаў. З вялікім адрывам ад сапернікаў перамогу і тытул «Студэнт года ONLINE» завяваала студэнтка БНТУ Ірына Марцінкевіч.

На другой ступені — будучы выратавальнік Настасся ЛУФЕРЧЫК.

А далей усіх удзельнікаў і гасцей чакаў сюрпрыз: упершыню за трохгадовую гісторыю конкурсу, акрамя дадатковай анлайн-намінацыі і першага месца, з'явіліся другая і трэцяя пазіцыі. Апошнюю з іх заняў студэнт Гомельскага камандна-інжынернага інстытута Кірыл Чупругін. Другое месца дасталася таксама будучай выратавальніцы Настассі Луферчык. А перамогу нечакана для многіх заваявала Марыя Філімонава. Нечакана таму, што з усіх удзельнікаў яна сапраўды вылучалася. Але не дэманстратыўнай упэўненасцю ў сабе, не кідкім пазіцыянаваннем сябе як самай лепшай, не памкненнем да перамогі любой цаной, а… сваёй натуральнасцю. Пры гэтым выглядала стыльна і прыгожа.

Зрэшты, пераможца прызналася карэспандэнту «Чырвонкі», якая першая ўзяла ў яе інтэрв'ю, што для яе самой перамога стала нечаканасцю.

— Я спадзявалася на трэцяе месца. Але калі абвясцілі трэцяе, а затым другое, нават стала крыху сумна… І раптам я — першая! Было вельмі неспадзявана і ад гэтага ўтрая больш прыемна.

— Як думаеш, чым скарыла членаў журы?

— Нават не ведаю… Я была такая, якая ёсць, рабіла тое, што падабаецца, была шчырай.

— І як гэта — адчуваць сябе студэнткай года?

— Пакуль я яшчэ не вельмі зразумела, але магу толькі сказаць, што гэта цудоўна! Не, гэта — супер!

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

СТО АДЦІСКАННЯЎ АД ПАДЛОГІ? ДЫ ЛЁГКА!

Наша першая сустрэча з Вікторыяй Макоўскай, вучаніцай 11 класа Ліцэя БДУ, адбылася ў пачатку верасня. Незвычайна сур'ёзная дзяўчына ў спартыўным адзенні адразу прыцягнула маю ўвагу. Чамусьці я падумала, што яна прадстаўнік якога-небудзь новага моладзевага руху. Але... праз некалькі месяцаў убачыла Вікторыю на ліцэйскім спартыўным свяце, дзе яна ўстанавіла рэкорд па адцісканнях. Дзяўчына па-ранейшаму заставалася для мяне загадкавай, таму я вырашыла пазнаёміцца з ёй бліжэй.

— Вікторыя, ты здзівіла мяне: як такая кволая на выгляд дзяўчына можа быць такой фізічна моцнай?

— Усё вельмі проста. У трэцім класе я зразумела, што вучоба даецца мне вельмі лёгка і я праводжу за ёй зусім мала часу. Тады і вырашыла, што час трэба бавіць з карысцю для сябе. І пайшла ў секцыю плавання. Паралельна мяне захапілі спартыўныя танцы і настольны тэніс. У дзесяць гадоў я вырашыла пачаць займацца адзінаборствамі: рукапашным боем і тайскім боксам. А што тычыцца ста адцісканняў на спартландыі — гэта мой асабісты рэкорд. Спорт дапамагае мне пераадолець сябе, сваю ляноту, праявіць моц духу. Таму ў адзінаборствах я не люблю біцца з дзяўчатамі, я баюся іх пабіць (*смяецца*).

Дзяўчына размаўляла па-беларуску, і гэта мяне таксама вельмі зацікавіла.

— Вікторыя, а ты заўсёды размаўляеш на беларускай мове?

— Так, амаль заўсёды. Справа ў тым, што да Ліцэя БДУ я вучылася ў беларускамоўнай гімназіі, дзе настаўнікі і вучні размаўлялі толькі на роднай мове. Гэта так захапіла мяне, што ў чацвёртым класе я таксама вырашыла паспрабаваць. Але з прычыны таго, што да школы я ніколі не размаўляла па-беларуску, мне было вельмі цяжка, таму максімум, колькі я вытрымлівала, быў адзін дзень. Канчатковае рашэнне размаўляць толькі на роднай мове прыйшло да мяне пасля шостага класа, у летніку, дзе важаты таксама размаўляў па-беларуску. Часта бывалі канфузы: людзі на вуліцах, у крамах, у транспарце не разумелі, што я ім кажу. Аднойчы ў краме я папрасіла паказаць мне рыдлёўку, але мяне не зразумелі. Давялося тлумачыць па-руску.

ПРА АЎТАРА

Святлане 16 гадоў. Яна вучыцца ў класе філалагічнага профілю. Па ўласным прызнанні, акрамя захаплення гісторыяй, біялогіяй, выяўленчым мастацтвам, сучаснымі танцамі і тэатрам, займаецца спортам: бегам і баскетболам.

— Спрабую сябе ў якасці журналіста і пісьменніка, люблю падарожнічаць і адкрываць новыя мясціны, — кажа дзяўчына.

Сярод жыццёвых памкненняў Святланы — мара стаць журналістам, каб дапамагаць людзям разбірацца з іх праблемамі. «Але самае галоўнае — мець моцную сям'ю», — дадае яна.

— Якой мовы ты прытрымліваешся дома і ў Ліцэі?

— Беларускай. І бацькі ўжо звыкліся, хоць па першым часе ставіліся насцярожана. У Ліцэі размаўляю па-беларуску з першых дзён.

— Як на гэта рэагуюць сябры? Ці шмат іх у цябе?

— Я лічу, што шмат сяброў не бывае. Мае сябры — гэта мае аднадумцы. Разам мы падарожнічаем аўтастопам, удзельнічаем у археалагічных экспедыцыях (на жаль, пакуль толькі як валанцёры, але я спадзяюся, што ўсё яшчэ наперадзе), захапляемся парашутным спортам. Нам цікава ткаць і фатаграфаваць з дахаў прыгожыя краявіды...

— Ты шмат падарожнічаеш...

— Я аб'ездзіла ўсе вобласці Беларусі. У Бялынічах і Гальшанах была на раскопках замчышчаў. Але самыя незабыўныя ўражанні пакінуў Браслаў. Такіх цудоўных краявідаў, як там, я не бачыла нідзе, таму ён стаў для мяне другім родным горадам пасля Мінска. Наогул, я люблю падарожнічаць яшчэ і таму, што ў дарозе адчуваю сябе свабоднай. Калі я ў дарозе, дык быццам яднаюся з ёю. Тады для мяне існуе толькі дарога ды вецер, які пяе ў вушах, і я адчуваю нейкі палёт.

— Напэўна, калі ты шмат падарожнічаеш і ўдзельнічаеш у раскопках, то любіш і прыгодніцкія, гістарычныя раманы...

— Для мяне не мае значэння, гістарычная кніга ці не, галоўнае — гэта яе філасофія, думка, якая закладзена аўтарам. Больш за ўсё мне падабаюцца творы Уладзіміра Караткевіча, з якімі я пазнаёмілася першы раз пасля шостага класа. Асабліва ўразілі «Каласы пад сярпом тваім» і «Ладдзя Роспачы». Да рускай і замежнай літаратуры я таксама стаўлюся станоўча. Мне, напрыклад, вельмі падабаюцца кнігі Гётэ.

— З якой мэтай ты паступіла ў Ліцэй? Ці спраўдзіліся твае надзеі?

— Безумоўна, з мэтай атрымання якаснай адукацыі. Паступіць у Ліцэй было для мяне фанатычнай марай, а вячэрнія курсы, якія я наведвала, толькі дапамаглі мне. Тут зусім іншая атмасфера, чым была ў школе: шмат зацікаўленых сваёй справай людзей, якія, як і я, лічаць, што кожны чалавек — гэта цэлы сусвет.

— Як ты ставішся да ліцэйскіх дыскатэк, якія з задавальненнем наведваюць вучні?

— Я не вельмі люблю сучасныя дыскатэкі. Куды больш мне падабаюцца сярэднявечныя танцы, якіх я ведаю шмат. Я з павагай стаўлюся да фолку і песень беларускіх бардаў, але з сучаснай музыкі мне таксама шмат што падабаецца.

— Вікторыя, ты маеш сваю жыццёвую філасофію, у цябе свае захапленні, свая манера паводзін. А як наконт стылю ў знешнім выглядзе?

— Звычайна я апранаюся зручна, у такое адзенне, якое не перашкаджае рухам. Таму сукенкі, спадніцы і касметыка — гэта не для мяне (*усміхаецца*).

— Якія якасці характару табе падабаюцца, а якія хацелася б змяніць?

— Часам мне не хапае ўпэўненасці ў сваіх сілах, я не магу штосьці зрабіць: баюся, што ў мяне не атрымаецца. Не ведаю, добра гэта ці дрэнна, але я вельмі самакрытычная, і гэта таксама неаднойчы перашкаджала мне. Часам я проста марную час, калі не знаходжу, чым заняцца, а часам мяне бярэ ў палон страшэнная лянота (*смяецца*).

...Развітваючыся з Вікторыяй, падумала, што гэтая дзяўчына сапраўды незвычайная. У яе шырокае кола захапленняў, багаты ўнутраны свет, вялікая сіла волі. Вікторыю не мучыць пытанне, чым заняцца, як правесці вольны час. Яна не скардзіцца на сум, бо ёй няма калі сумаваць. Нягледзячы на свой узрост, Вікторыя ўжо мае жыццёвы стрыжань. Дзяўчына шчыра любіць сваю Радзіму і кажа, што ні ў якім разе не пакіне яе, бо ёй тут камфортна.

Варта толькі больш уважліва прыгледзіцца да сваіх аднакласнікаў — і перад намі раскрыецца непаўторны юнацкі свет, поўны захапленняў, планаў і надзей.

Святлана ГАЛУЗА,
вучаніца 11 класа
Ліцэя БДУ.

АД РЭДАКЦЫІ

З сённяшняга нумара «Чырвонка» пачынае друкаваць творчыя работы маладых няштатных аўтараў, якія паступілі на конкурс «Мы — такія!..» Рэдакцыя запрасіла ўсіх ахвотных скіраваць свае «пробы пяра» на лёсы і захапленні цікавых людзей, якіх так многа вакол нас! І, напэўна, сімвалічна, што першыя з дасланых матэрыялаў прысвечаны равесніцы нашых аўтараў і слыннаму прадстаўніку ранейшага пакалення...

Усім патэнцыяльным удзельнікам нашага конкурсу застаецца толькі нагадаць, што матэрыялы да ўдзелу ў ім прымаюцца ТОЛЬКІ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ. Дасланыя працы ПАВІННЫ АДПАВЯДАЦЬ УМОВАМ КОНКУРСУ. Больш падрабязна з імі можна азнаёміцца ў нумарах «Чырвонкі» ад 26 верасня і 31 кастрычніка або на сайце газеты.

ГЕНЕРАЛ КАРОЛЬ З ДВАРЦА

Напярэдадні свята Вялікай Перамогі вучні гімназіі, займаючыся пошукавай работай, усё часцей звяртаюцца да лёсу тых, хто стаў легендай нашай Бацькаўшчыны: — людзей мужных, моцных духам, сапраўдных патрыётаў роднай зямлі. У часы страшнай навалы яны абаранялі Радзіму ад лютага ворага, не шкадуючы сіл і жыцця. Такім чалавекам быў і застаецца для нас генерал-лейтэнант авіяцыі Сцяпан Георгіевіч Кароль з вёскі Дварэц.

Нарадзіўся Сцяпан Георгіевіч у сялянскай сям'і. Бацька памёр рана, пакінуўшы пяцярых дзяцей. Сваёй зямлі не было, таму маці працавала па найме, беручы з сабой на заробкі дзяцей. Сцяпан рана стаў самастойным. Быў вучнем у саматужніка-адзіночкі, спасцігаў рамяство, якое неаднойчы потым спатрэбілася ў жыцці. Дзеці Сцяпана Георгіевіча, Радамір і Рэната, прыгадваюць, што бацька мог зрабіць пры дапамозе простых сталярных інструментаў любую рэч і вельмі любіў займацца такой справай у вольны час.

Нягледзячы на здольнасці, працы юнаку не знайшлося, таму давялося наймацца на чыгунку ў Наваельні. Перад Першай сусветнай вайной некалькі маладых хлопцаў з Дварца завербаваліся на будаўніцтва маньчжурскай чыгункі. Вярбоўшчыкі абяцалі добры харч і заробак. Ужо на будоўлі Сцяпан і яго сябар-аднавясковец Аляксей захварэлі на тыф. Аляксей памёр, а Сцяпана лёс пашкадаваў.

Калі пачалася імперыялістычная вайна, яго прызвалі ў армію. Сцяпан марыў трапіць у кавалерыю, нават адважыўся прадэманстраваць начальству свае здольнасці. Яго ўзялі, а хлопцы з Дварца трапілі ў сібірскія палкі. Многія амаль адразу загінулі, кінутыя ў Брусілаўскі прарыў. Ён адзін з мястэчка выжыў. Яго далейшы лёс вызначыў шчаслівы выпадак.

Аднойчы салдат пастроілі на пляцы, афіцэр паказаў нейкую раму і спытаў: «Хто з вас можа такое зрабіць?» Наперад выйшаў Сцяпан: «Я зраблю». Сцяпана павялі ў штаб, дзе той даведаўся, што набіраюць групу ў авіяцыю. Што гэта такое, ён не ведаў, але іншыя хлопцы сказалі, што там добра кормяць, і ён згадзіўся.

Ужо напрыканцы 1915 года хлопец лятаў на самалёце. Ваяваў у 29-м авіяцыйным атрадзе спачатку на Заходнім фронце на тэрыторыі Беларусі, потым у Прыбалтыцы аж да лютага 1918 года.

Падчас Кастрычніцкай рэвалюцыі Сцяпан Георгіевіч Кароль быў выбраны членам ваенна-рэвалюцыйнага камітэта авіяатрада. На адным з яго пасяджэнняў было вырашана афіцэраў расстраляць, а тэхніку знішчыць. Але Кароль і яшчэ некалькі членаў камітэта раздалі салдатам 300 коней, якія былі ў атрадзе, і адпусцілі дадому. Самалёты пагрузілі на платформы і накіраваліся ў Петраград. У канцы 1918 — першай палове 1919 года Сцяпан Кароль ваюе на Карэліцкім фронце. Шмат лятае, выпрабоўвае самалёты. У гэты час тры разы прысутнічаў на мітынгу, дзе выступаў У.І. Ленін. Такія сустрэчы натхнялі маладога лётчыка — хацелася быць карысным новай уладзе, свайму народу.

Генерал С.Г. Кароль у 1970-я гады.

З ліпеня 1919 года па сакавік 1920 года вучыцца ў Ягор'еўскай авіяшколе пад Масквой. Вучобу перапыніла наступленне Дзянікіна. Курсантаў тэрмінова забіраюць на фронт. Перад адпраўкай Сцяпан Георгіевіч уступае ў бальшавіцкую партыю.

Скончылася грамадзянская вайна, краіна бралася за мірную працу, за развіццё прамысловасці. Авіяцыя таксама патрабавала ўвагі. Авіяцыйных заводаў у краіне не было, самалёты даводзілася купляць за мяжой, у Германіі. Прамых дыпламатычных сувязяў з ёй краіна Саветаў не мела, таму куплялі самалёты пры пасрэдніцтве Галандыі. Вясной 1924 года Сцяпан Георгіевіч Кароль і Аляксей Якаўлевіч Бадзюлін, як лепшыя лётчыкі, былі накіраваны кантралёрамі па вырабе самалётаў на завод «Фокер» у Галандыю.

Калі фірма скасавала дагавор на пастаўкі самалётаў, Кароль вярнуўся ў Саюз, служыў у Ленінградзе. Тут пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай, Анімалісай Смяловай, сястрой камісара авіяатрада, які ўзначальваў. У 1927 годзе маладая сям'я пераязджае ў Ліпецк. Пераязджалі ўжо з двума дзецьмі: гадавалай Рэнатай і трохмесячным Радамірам.

У эскадрыллі, дзе служыў Кароль, тады, па дамоўленасці з урадам СССР, праходзілі падрыхтоўку нямецкія лётчыкі, сярод якіх быў Генрых Герынг. Ёсць меркаванне, што Кароль служыў у 1927 годзе ў Ліпецку разам з Валерыем Чкалавым, але дакументальна гэта не пацверджана.

Вясной 1933 года наш зямляк служыць у Бабруйску. Адначасова ён кіраваў будаўніцтвам аэрадрома і ваеннага гарадка. Быў на Радзіме, а з маці пабачыцца не мог: Дварэц апынуўся па-за межамі Савецкай Беларусі. Час быў складаны, усюды бачыліся дыверсанты і шпіёны. Аднойчы лётчык з іх дывізіі з прычыны тэхнічнай паломкі вымушаны быў сесці на тэрыторыі Польшчы. Пасля таго, як лётчыка разам з самалётам польскія ўлады вярнулі на наш бок, яго адразу арыштавалі. Летам 1937 года ў палку пачаліся масавыя арышты. Караля вызвалілі ад пасады, выключылі з партыі. Жыццё аказалася пад пагрозай.

Восенню 1937 года Сцяпан Георгіевіч паехаў у Маскву і паступіў у распараджэнне камандуючага Ваенна-Паветранымі сіламі Чырвонай Арміі. Жыў у гасцініцы з такімі ж вызваленымі ад пасады ваеннымі і ўвесь час чакаў арышту. Некалькі разоў выклікалі на допыт, «падкопваліся» пад Тухачэўскага, які некалі прыязджаў у часць, дзе служыў Кароль. Так доўжылася да студзеня 1939 года. Калі рэпрэсіі крыху прыпыніліся, яго выклікалі на партыйную камісію і аднавілі членства ў партыі.

Калі пачалася вайна, ён удзельнічаў ў абароне Растова. Лётчыкі яго дывізіі былі пакінуты для абароны моста цераз Дон. Змагаліся да апошняга. Мост уцалеў. Цераз яго ішла эвакуацыя абсталявання заводаў і жыхароў горада.

У маі 1942 года Сцяпана Георгіевіча назначылі камандзірам 148-й знішчальнай авіядывізіі, якая пазней удзельнічала ў бітве на Курскай дузе.

Калі баі адышлі далёка на Захад, Сцяпан Георгіевіч быў начальнікам гарнізона Кіева. Сям'я таксама пераехала сюды, дзе і засталася пасля вайны. Начальнікам гарнізона Кароль быў да сакавіка 1946 года. Сын Радамір вучыўся ў Маскоўскім авіяцыйным інстытуце, дачка Рэната — у Кіеўскім дзяржаўным універсітэце на філалагічным факультэце.

Пасля вайны армію пачалі скарачаць, Сцяпана Георгіевіча прызначылі начальнікам факультэта Акадэміі супрацьпаветранай абароны ў Харкаве. Там ён жыў адзін, пакуль у 1951 годзе па стане здароўя не выйшаў у запас у званні генерал-лейтэнанта авіяцыі.

Сцяпан Георгіевіч Кароль памёр 20 студзеня 1975 года ў Кіеве. Але ніколі не знікне з нашай гісторыі імя аднаго з першых авіятараў краіны, мужнага сына Дзятлаўшчыны. Яму прысвечаны экспазіцыі ў Музеі народнай славы і музеі гімназіі №1 г. Дзятлава. Чалавек жыве, пакуль жывая добрая памяць пра яго.

Кацярына МАКСІМОВІЧ,
вучаніца 10 класа гімназіі
№1 г. Дзятлава.

ПРА АЎТАРА

Кацярыне 16 гадоў. Як расказала нам настаўніца беларускай мовы і літаратуры гімназіі №1 г. Дзятлава Алена Рыгораўна Абрамчык, кіраўнік гуртка «Юны журналіст», які наведвае дзяўчына, Кацярына — выдатніца. Рыхтуецца паступаць у медыцынскі ўніверсітэт. Пераможца раённых прадметных алімпіяд па хіміі, біялогіі, беларускай мове. Захапляецца чытаннем класічнай беларускай літаратуры. Цікавіцца журналістыкай: піша нататкі ў гімназічную газету «Віват, гімназісты!», друкуецца ў раённай газеце. А сёння свой матэрыял Кацярына выносіць на суд чытачоў і журы творчага конкурсу «Чырвонкі».

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
28 11 2013 г.

Новы ўзровень

«PROSSPEKT»:

«У ВЫСТУПЛЕННІ ЁСЦЬ ТОЕ, ЧАГО НЯМА Ў ЗВЫЧАЙНЫМ ЖЫЦЦІ»

Гурт «PROSSPEKT» — з ліку тых маладых калектываў, якія не так даўно з'явіліся, але ўжо заявілі пра сваё існаванне, выступаюць на розных музычных пляцоўках. На сёння яны выпусцілі ўласны альбом, знялі тры кліпы і паспрабавалі сябе ў іншых праектах. Так, напрыклад, гурт удзельнічаў у мюзікле «Rock of ages» у краінах Паўночна-Усходняй Азіі, не адзін сезон выступае сумесна з Белдзяржцыркам, а зараз займаецца новай праграмай. Пра музыку на сцэне і ў жыцці, эксперыменты і тэндэнцыі ў ёй мы разважаем з вакалістамі «PROSSPEKTa» Вольгай Палюшык і Мікалаем Знахарчуком.

— Нядаўна вы вярнуліся з міжнароднага фестывалю KoloritFest, які праходзіў у Празе. Якія ўражанні засталіся?

Вольга: Мы наведвалі Прагу ўжо ў трэці раз, але з групай у поўным саставе паехалі туды ўпершыню. Даўно было жаданне там апынуцца, бо Прага — горад з асаблівай энергетыкай. На фестывалі былі розныя цікавыя сустрэчы, майстар-класы. Мы ігралі на адкрыцці. А потым была магчымасць адпачыць і панаziраць за іншымі ўдзельнікамі. Набылі новы вопыт.

— Гэта не першае ваша выступленне за мяжой. Што можаце сказаць пра рэакцыю публікі?

Вольга: У Чэхіі жыве шмат беларускіх эмігрантаў, і там беларуская культура прадстаўлена досыць шырока. На канцэрце былі людзі, якія ведалі наш калектыў, і тыя, хто бачыў і чуў нас упершыню. Прыём публікі быў вельмі цёплым. І мы адчувалі сябе камфортна.

Мікалай: На канцэрце ў асноўным была моладзь. А рэакцыя такой аўдыторыі залежыць ад таго, як ты сябе праяўляеш на сцэне. Калі мы выступалі ў Азіі, дык рэакцыя была кардынальна іншай, бо само з'яўленне еўрапейцаў на сцэне там вітаецца апладысментамі. А ў Празе адчувалася весялосць і свабода.

— Вы родам з аднаго горада? Як даўно знаёмыя?

Мікалай: Ужо дванаццаць гадоў. Можна сказаць, амаль жылі па суседстве і нават хадзілі ў адну і тую ж краму.

Вольга: Наша знаёмства адбылося ў дзіцячым летніку. Потым зніклі з жыцця адно аднаго на нейкі перыяд. Але пазней пачалі сустракацца на нейкіх конкурсах, фестывалях. Абодва прыехалі ў Мінск паступаць — праўда, вучыліся ў розных ВНУ.

— А з астатнімі ўдзельнікамі вашага гурта як сустрэліся?

Вольга: Састаў нашай групы фарміраваўся цягам года.

Мікалай: Напрыклад, наш клавішнік Альберт (Красноў. — **Аўт**.) і бас-гітарыст «Vovchik» (Уладзімір Развадоўскі. — **Аўт**.) працавалі разам яшчэ да таго, як прыйшлі да нас. Барабаншчык і гітарыст — браты (Ягор і Арцемій Даронкіны. — **Аўт**.). Арцемій быў кандыдатам на галоўную ролю ў кліпе «Рэчанька». Мы сустрэліся з ім на кастынгу і запрасілі здымацца. Потым даведаліся, што ён іграе на гітары. А ў нас тады якраз месца гітарыста было свабоднае і ён прыняў нашу прапанову. Яшчэ і брата, барабаншчыка, прывёў з сабой.

— Песня «Рэчанька» была вашым першым крокам на вялікую сцэну. Ці не ўзнікала думкі зрабіць яшчэ нешта ў такім жа ключы?

Вольга: Каб працягнуць эксперымент, трэба дачакацца спрыяльных умоў для такога кроку. Тады гэта адбылося натуральна.

Мікалай: Рабіць альбом народных песень у рок-варыянце, мабыць, сёння не мае сэнсу. Але нам неяк раілі папрацаваць над той жа «Купалінкай». Таму, не выключана, калі з'явіцца вольны час (бо зараз наша ўвага засяроджана на ўласных песнях), мы падумаем. Наогул хацелася б выйсці на такі ўзровень, каб, прыязджаючы з гастролямі ў нейкую краіну, маглі на канцэрце спяваць нешта з яе народных песень.

— Ваша група смела эксперыментуе. Збіраецеся і ў бліжэйшы час нечым здзівіць?

Мікалай: Мы зараз актыўна працуем над перакладам нашых песень на англійскую мову. Таму што даволі часта здараюцца сітуацыі, калі замежная публіка пытаецца, пра што мы спяваем.

Вольга: У планах таксама зрабіць кліп у стылі мінімалізму. Ужо нават матэрыял здымалі ў Франкфурце. Паглядзім, што з гэтага атрымаецца.

— Як ставіцеся да тэндэнцыі здымаць кліпы амаль на кожную песню?

Мікалай: Нехта робіць іх на кожную песню з альбома, а хтосьці — толькі на самыя яркія хіты. Для кожнага артыста гэта індывідуальна.

Вольга: Здараецца, што артыст ці група выпускаюць альбом і наогул не здымаюць ніводнага відэакліпа. А бывае і наадварот, калі ты нават не думаеш пра такі ход, а абставіны складваюцца так, што з'яўляюцца магчымасці і жаданне зрабіць «карцінку».

Мікалай: Мы ў групе выступаем за тое, каб здымаць кліп, калі можна, бо так больш поўна перадаецца сэнс, «малюнак» думак, закладзеных у песні.

Вольга: Напрыклад, мая маці, калі паглядзела наш кліп на песню «My Home Is A Planet», сказала: «Вось зараз я зразумела вашу задуму».

— Што вы адчуваеце на сцэне? Ці прысутнічае яшчэ хваляванне?

Мікалай: Кожнае выступленне — магчымасць раскрыцца. Можна рабіць усё, што падабаецца і быць сабой сапраўдным. А хваляванне часцей за ўсё прысутнічае перад выхадам на сцэну.

Вольга: Хваляванне павінна знікаць, як толькі ты выходзіш з-за куліс. Калі артыст на сцэне, — ён гаспадар становішча, павінна прысутнічаць упэўненасць у сабе. Нам камфортна, калі мы выходзім да гледача. Магчыма, таму ўдаецца выкладвацца па поўнай праграме...

— Чаго, на ваш погляд, сёння не хапае беларускаму шоу-бізнесу?

Мікалай: Мне здаецца, што бракуе маладых выканаўцаў.

Вольга: Не хапае канкурэнцыі. А без яе добры ўзровень немагчымы, хаця ў нас і шмат таленавітых людзей.

Алена ДРАПКО.

Святло надзеі

У КОЖНАГА ПАД НАГАМІ — СВАЁ «МЕСЦА МОЦЫ»

Беларускі гурт «Нельга забыць» існуе ўжо чатыры гады. На рахунку музыкантаў тры тэматычныя праграмы і перамога ў фестывалі «Бардаўская восень», які штогод праходзіць у Польшчы. Падчас «жывога» выступлення «НЗ» нібы паглыбляешся ў нейкі светлы філасофскі транс. Камусьці гэта можа быць даспадобы, камусьці не, але абыякавым не застаецца ніхто — гэта сапраўды нельга забыць. Пра асаблівую аўру гурта і асэнсаванне рэчаіснасці мы гутарым з лідарам калектыву Міхаілам Бараноўскім.

— Чатыры гады — дастатковы перыяд для «раскруткі». Тым не менш, пра «Нельга забыць» ведаюць не шмат людзей. Чаму?

— Магчыма, з-за нашай сціпласці. Не хацелася заяўляць пра гурт без упэўненасці ў сабе як у артыстах і штучна старацца яго некуды «прапіхнуць». Калі мы пачнём гэта рабіць, знікне пэўная аўра ад гурта. Мне яна нашмат даражэйшая, чым танная папулярнасць.

— Што гэта за аўра і як яна ствараецца?

— Людзі прыходзяць на нашы канцэрты не проста адпачыць, а эмацыянальна папрацаваць разам з намі, зрабіць пэўны высілак, паглыбіцца ў тэму. Ствараецца такая вельмі спецыфічная, даверлівая атмасфера, якая аб'ядноўвае залу. Слухача нельга падманваць, бо людзі адчуваюць, калі артыст няшчыры. Таму мы працуем на максімуме магчымасцяў. «Нельга забыць» сваёй творчасцю ўзнімае пытанні, актуальныя для ўсіх, каб кожны мог знайсці нешта сваё. Гэта важны падмурак для наладжвання сувязі. Яшчэ адзін складнік — пэўная эмацыянальная нотка, якую мы задаём нашай музыкай, яна пастаянна трымае людзей «у тонусе». І ўсе нібы пераносяцца ў іншую рэальнасць — і слухачы, і музыканты. Я нават не заўважаю, як праходзіць час выступлення.

— Чаму вы пачалі сваю творчасць з паэзіі Караткевіча?

— Праграма на вершы Уладзіміра Караткевіча стала штуршком, каб сабраць гурт. Бо ў мяне з'явілася пэўныя замалёўкі і хацелася іх музычна разнастаіць. У першую чаргу паўплывала асабістае стаўленне да сентыментальнага рамана «Леаніды не вернуцца да зямлі», ці «Нельга забыць». Твор і даў назву гурту, хаця, з пункту гледжання псіхалогіі, назва, у якой ёсць адмоўная часціца, няправільная, але гэта нават мае сваю цікавінку.

— «Стратэгія» спрацавала, гурт склаўся. Што за людзі прыйшлі ў яго?

— Аднойчы на вуліцы пабачыў кампанію, што іграла на гітарах, пазнаёміўся. Адзін з гітарыстаў, Віталь Мурзіч, стаў нашым удзельнікам. Надзея Процька (скрыпка, вакал) трапіла ў гурт пасля таго, як наведала некалькі мерапрыемстваў у музеі (Міхаіл з'яўляецца навуковым супрацоўнікам літаратурнага музея Максіма Багдановіча і загадчыкам яго філіяла «Беларуская хатка». — **Аўт**.). Уладзімір Пыльчанка прыйшоў да нас яшчэ ліцэістам, але яго ўзровень валодання акардэонам нас цалкам задаволіў. Апошняй з'явілася перкусіяністка Вольга Куваева. Праўда, з намі яна ўжо не іграе, але часам прыходзіць дапамагаць. Ва ўсіх удзельнікаў ёсць іншыя заняткі, акрамя «НЗ»: Уладзімір вучыцца на юрыста, Надзея іграе ў аркестры музычнага каледжа і выкладае ў адным з цэнтраў дзіцячай творчасці. Віталь — дызайнер. Яшчэ да нас далучыліся два чалавекі — гітарыст Максім Сазонаў, які працуе метадыстам, і Андрэй Байбакоў (перкусія і бубны) — праграміст. А я па адукацыі гісторык.

— І што вас прывяло ў музыку?

— Магчымасць афармляць пачуцці не толькі словамі, а гэткай музычна-паэтычнай дзеяй. Я стараюся не раз'ядноўваць музыку і паэзію, таму часта звяртаюся да творчасці класікаў, а ў песнях вялікую ўвагу надаю слову. Я лічу, што гэта вельмі важны складнік, хоць зараз не так шмат музыкантаў працуюць над ім належным чынам.

— Як нараджаюцца вашы праграмы?

— Усё гэта адбываецца неяк інтуітыўна і раптам. Я працую ў музеі пяць гадоў, і толькі на пачатку пятага года працы ў мяне нечакана з'явіліся песні на словы Багдановіча. Увогуле, творчасць — гэта такая дзея, якая нараджаецца ўнутры. Бо спачатку хочацца адказаць на пытанні самому сабе.

«Нельга забыць» сваёй творчасцю ўзнімае пытанні, актуальныя для ўсіх, каб кожны мог знайсці нешта сваё.

— А што імкняцеся данесці да аўдыторыі?

— У нас усяго тры праграмы, і кожная, як нам падаецца, дае магчымасць асэнсаваць нейкія сутнасныя рэчы. Першая — «Леаніды не вернуцца да зямлі» — пра каханне: сапраўднае, з эмоцыямі і шаленствам. Пра тое, як пачынаеш па-іншаму бачыць свет, які нас акружае. Пра каханне, што робіць чалавека чалавекам.

Другая праграма «Месца моцы» на мае ўласныя вершы прысвечана чалавеку ў сучасным беларускім грамадстве. «Месца моцы» — гэта паганскае свяцілішча ў Белавежскай пушчы на тэрыторыі Польшчы. Старажытнае, спрадвечнае для беларусаў месца, дзе яны маглі звяртацца да багоў і далучацца да іх сілы, цяпер па-за межамі нашай дзяржавы. Але мы кажам аб тым, што насамрэч у кожнага гэтае «месца моцы» — сваё, і яно знаходзіцца «тут», пад нагамі. Зноў жа, як у Караткевіча: «Кожны чалавек носіць сваё неба з сабою».

Трэцюю праграму, якую мы назвалі жудасным словам «Mertvets», плануем прэзентаваць гэтай зімой. Гэта не смакаванне некрафіліі і дэкадэнцтва, а спроба зразумець сусвет праз прызму смерці на прыкладзе вершаў Максіма Багдановіча. Ён восем гадоў пражыў з невылечнай хваробай і быў гатовы ў любы момант пайсці з жыцця. Смерць стала сааўтарам яго беларускіх вершаў, бо час, калі ён звярнуўся да іх, якраз прыпадае на першыя праявы сухотаў. І калі напачатку творчасць яго была даволі цёмнай, то далей усе перажыванні паэта пераліліся ў тонкае ўспрыняцце і разуменне свету, якое ён навучыўся перадаваць словам. Усе ў яго акружэнні дзівіліся, наколькі ён сябе аддае гэтай працы — шчыра і дашчэнту. Як чалавек, якому няма чаго страчваць, апроч ідэі. Ад гэтага дрыжыкі бягуць па скуры. Мы прапануем слухачам разам паразважаць пра гэта.

Але нашыя выступленні — ці то маленькія праграмы, ці то вялікія — ніколі не заканчваюцца цемрай, а заўсёды пакідаюць святло надзеі. Як у адным з апошніх вершаў Багдановіча: «Я не самотны, я кнігу маю».

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

Удалечыні ад дома

«АДПРАЦОЎКУ ЎСПРЫМАЮ ЯК ПРЫГОДУ»

Большасць выпускнікоў бюджэтных аддзяленняў ВНУ імкнецца «зачапіцца» за месца працы калі не ў сваіх, то хаця б у буйных гарадах. Але ёсць і тыя, каго лёс заводзіць на зусім не блізкую перыферыю. Як жывецца і працуецца маладому спецыялісту ў маленькім гарадку на мяжы Беларусі з Расіяй, і як наладжваюцца стасункі ў складаным калектыве, даведалася карэспандэнт «Чырвонкі».

«Здаецца, палову жыцця праводжу ў цягніках», — жартуе Іван. Вось так своеасабліва ажыццявілася колішняя мара звязаць лёс з чыгункай.

Выпускнік Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна Іван Бяляй ужо другі год працуе па размеркаванні. Выбіраць месца маладому педагогу-інжынеру давялося паміж двума райцэнтрамі на заходняй і ўсходняй ускраінах Беларусі — Ашмянамі і Клімавічамі. Не вёскі, вядома, але пасля горада з такім буйным прадпрыемствам, як нафтаперапрацоўчы завод, кантраст даволі рэзкі. Урэшце Іван спыніўся на другім варыянце. Вырашыла ўсё адлегласць: Клімавічы аказаліся бліжэйшымі да роднага Мазыра — «ўсяго» 400 кіламетраў. І цяпер малады чалавек выкладае ў Клімавіцкім дзяржаўным прафесійным ліцэі № 14 чарчэнне, матэрыялазнаўства, устройства сельгасмашын, абсталяванне і тэхналогію зварачных работ. Акрамя таго, вядзе вучэбны вытворчы камбінат у школьнікаў, працуе і з навучэнцамі вячэрняга аддзялення.

Іван прызнаецца, што ў педагогіку ён ісці не збіраўся. Калісьці малады чалавек марыў стаць машыністам, паступаў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту ў Гомелі, але прайшоў толькі на платнае аддзяленне. Плаціць за вучобу на той час не было магчымасці: маці гадавала сына адна. Таму пайшоў у вучылішча, дзе атрымаў спецыяльнасць электрыка трэцяга разраду. Пасля, вырашыўшы ўсё ж займець і вышэйшую адукацыю, паступіў ва ўніверсітэт у Мазыры, і так лёс прывёў яго да выкладання.

— Мне было цікава, — дзеліцца Іван уражаннямі ад працы, — я люблю вандраваць, а тут — новае месца, новыя людзі. Адразу далі пакой у інтэрнаце. Праўда, праз месяц гэтая цікаўнасць стала згасаць, з'явілася звычка. Цяпер успрымаю ўсё проста як прыгоду ў сваім жыцці.

Тое, што запалу ў маладога спецыяліста хапіла ненадоўга, ён звязвае не столькі з працай, колькі з ладам жыцця. Бо, акрамя работы, у невялікім горадзе маладому чалавеку і пайсці асабліва няма куды. Нават зарплату (Іван атрымлівае каля 2,4 мільёна рублёў, але заробак абяцаюць павялічыць да 3 млн), па словах хлопца, траціць тут няма на што. Пэўны час наведваў басейн з саўнай, якія ёсць у аздараўленчым цэнтры пры адной са школ. Праўда, гэта было не столькі забавай, колькі неабходнасцю: у інтэрнаце пры ліцэі, дзе жыве малады спецыяліст, душ ужо доўгі час знаходзіцца на рамонце. У асноўным жа хлопец бавіць час за фільмамі на камп'ютары, сустракаецца з прыяцелямі, а яшчэ займаецца чарчэннем. Кожныя выхадныя стараецца ездзіць дадому ці да сваякоў у Магілёў. «Здаецца, палову жыцця праводжу ў цягніках», — жартуе Іван. Вось так своеасабліва ажыццявілася колішняя мара звязаць лёс з чыгункай. Зрэшты, выключным сваё становішча хлопец не лічыць, кажа, што ўсе маладыя спецыялісты, якія трапілі ў глыбінку, сутыкаюцца з падобнымі выпрабаваннямі.

Калі гаварыць пра выкладанне, дык добрых адзнак Іван Ігаравіч не шкадуе, калі бачыць, што чалавек стараецца. А калі не, то некалькі нізкіх балаў і выклік на савет прафілактыкі здольныя стымуляваць гультаёў.

Са сваімі вучнямі ён лёгка знаходзіць агульную мову, кажа, што канфліктаў яшчэ не было. Гэта пацвярджае і дырэктар ліцэя Ала Анціпава, адзначаючы кампетэнтнасць педагога. Адзінае, на што наракае малады спецыяліст, — гэта павышаная актыўнасць ліцэістаў, таму дысцыпліну «трымаць» часам бывае нялёгка. Але Івану Ігаравічу ўдаецца: падчас заняткаў у класе сапраўды пануе цішыня. На першы погляд, нічога асаблівага тут няма: навучэнцы, атрымаўшы заданне, моўчкі выконваюць яго, схіліўшыся над сшыткамі. Калі нехта з будучых каменшчыкаў-газаэлектразваршчыкаў парушыць дысцыпліну, для ўстанаўлення парадку дастаткова аднаго сур'ёзнага погляду выкладчыка, радзей — заўвагі. І толькі сам педагог ведае, як удаецца знайсці падыход да гэтых хлопцаў. Яны ж, у сваю чаргу, кажуць, што іх настаўнік не столькі строгі, колькі справядлівы.

— Выкладаць цікава, асабліва калі бачыш вынік і адчуваеш сваю карыснасць. Вось, «падцягнуў» у сваіх вучняў чарчэнне — цяпер ужо больш-менш разбіраюцца ў дэталях. А яшчэ мы можам проста размаўляць з хлопцамі на нейкія жыццёвыя тэмы. За час працы я прыдбаў добры педагагічны вопыт, навучыўся знаходзіць падыход да «складанага» калектыву, — падсумоўвае Іван Бяляй.

Між тым, малады чалавек не ўтойвае, што звыш прызначанага тэрміну заставацца ў Клімавічах не збіраецца. Пакуль рыхтаваўся матэрыял, ён ажаніўся, а ў будучыні бачыць сябе ў будаўнічай сферы: паралельна з працай па размеркаванні малады чалавек завочна атрымлівае другую вышэйшую адукацыю ў БНТУ.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
Фота аўтара.
Мінск — Клімавічы — Мінск.

Ен прыйшоў і… «Усе У Сталі»!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Па словах Андрэя, самае цяжкае ў працы за пультам кіравання — гэта сканцэнтравацца, быць сабраным і ўважлівым. Ну і яшчэ, відаць, стрэсаўстойлівым і згодным на мінімальную колькасць сну. Змена на заводзе доўжыцца з 9 да 9 гадзін. Андрэй, у прыватнасці, працуе па наступным графіку: дзень, на наступны дзень ідзе працаваць у ноч, пасля чаго мае два выхадных. Кажа, што да такога рэжыму прывыкаў досыць доўга. Арганізм чалавека ўсё ж настроены на тое, каб спаць ноччу. Нават калі намагаешся падрамаць «пра запас», сон аб сабе ўсё роўна нагадвае.

Педагог ці металург?

У сённяшнім супрацоўніку БМЗ спачатку «жыў»… патэнцыяльны студэнт філфака. Нейкі час Андрэй хацеў быць настаўнікам рускай мовы.

— У мяне ўся сям'я — выкладчыкі. І бацькі, і бабулі, родная сястра і стрыечныя сёстры, і цёткі. Відавочна, што быць металургам я з дзяцінства не марыў, — успамінае хлопец.

Аднойчы пасля дзявятага класа Андрэй вырашыў праверыць на ўласным вопыце, што ж такое паступленне. «Праверка» аказалася ўдалай, і хлопец з Рагачова апынуўся ў Жлобінскім дзяржаўным металургічным каледжы, дзе правучыўся чатыры гады.

Для таты і мамы, прафесія якіх — выкладаць музыку і грамадскія дысцыпліны, такое рашэнне сына зусім не было расчараваннем. Нават наадварот.

— Я з сям'ёй параіўся і вырашыў: буду вучыцца. Вялікую ролю, вядома, сыграла будучая зарплата, — распавядае Андрэй. — На той час розніца паміж заробкамі супрацоўнікаў металургічнага завода і астатніх жыхароў Жлобіна была заўважнай.

Вучыцца ўсяму, што звязана з апрацоўкай металу, — было справай няпростай.

Зарплата маладых спецыялістаў — металургаў — ад 4,5 да 6 мільёнаў рублёў.

— Да таго ж наша прафесія вельмі вузкапрофільная, з ёй не ў кожным горадзе знойдзеш работу. Таму большасць усё роўна працуе на БМЗ, — гаворыць хлопец.

Дарэчы, металургія — не выключна мужчынская сфера, як можна падумаць адразу. Андрэй кажа, што ў каледж з кожным годам ідзе ўсё больш дзяўчат. Не трэба думаць, што яны працуюць сталяварамі. У асноўным дзяўчаты знаходзяць сябе ў аддзеле тэхнічнага кантролю, лабараторыях.

Аб жыцці — з «разлікам»

Як паказвае самастойнае халасцяцкае жыццё, сапраўднаму металургу даводзіцца ўмець «прыгатаваць» не толькі які-небудзь сплаў, але і сёе-тое з ежы. Андрэй дадому ездзіць рэдка, хоць да Рагачова 40 хвілін на цягніку.

— Час, калі мама перадавала хатнія смакоцці, прайшоў. Зараз гатую сам. Стараюся, але ніякіх кулінарных подзвігаў за сабой пакуль не заўважаю, — распавядае Андрэй.

Але, у прынцыпе, праблему харчавання вырашае сталовая (іх, дарэчы, на БМЗ дзейнічае восем). На заводзе за паўнавартасны абед патрэбна аддаць дзесьці 20–25 тысяч рублёў, а стравы вельмі смачныя і разнастайныя.

Халасцяцкае жыццё пакуль праходзіць у інтэрнаце, месца ў якім хлопец атрымаў адразу ж пасля заканчэння вучобы. Інтэрнат знаходзіцца ў цэнтры горада. На завод работнікі звычайна ездзяць на грамадскім транспарце. Да працы дабрацца можна за 25 хвілін.

Лепшы Дзед Мароз Жлобіна: Андрэй перад Новым годам з металурга пераўвасабляецца ў вышэйзгаданы персанаж.

У кожным блоку — два пакоі і санвузел. У прынцыпе, умовы нядрэнныя. Калі вучыўся, жыў у інтэрнаце для студэнтаў, і пасля пераезду адразу адчуў розніцу: тут і рамонт добры, і мэбля больш новая. Што прыемна, шмат плаціць за інтэрнат не даводзіцца: максімум 40–50 тысяч у месяц, ды і суседзі нядрэнныя.

— Я стаю ў чарзе на жыллё, але да будаўніцтва яшчэ далёка, — распавядае Андрэй і прыводзіць няхітрыя падлікі: зарплата маладых спецыялістаў — металургаў — ад 4,5 да 6 мільёнаў рублёў. Калі браць крэдыт хоць бы на аднапакаёвую кватэру, то дзевяць месяцаў пасля першага ўзносу давядзецца выплачваць па 8 мільёнаў, а далей — штомесяц па 4,5 мільёна, і гэта на працягу 20 гадоў. Без дапамогі родных ці дадатковага заробку цяжкавата.

«Я зусім не «суровы»!»

— Ой, дык ён жа ў нас — лепшы Дзед Мароз Жлобіна! — менавіта так «прарэкламаваў» Андрэя яго калега, якога мы сустрэлі падчас прагулкі міма «халадзільніка».

Аказалася, што гэта зусім не жарт: Андрэй перад Новым годам сапраўды з металурга пераўвасабляецца ў вышэйзгаданы персанаж.

— Дзяцей вельмі люблю. А калі прыходжу да іх у касцюме Дзеда Мароза і віншую, атрымліваю шмат добрых эмоцый. Да таго ж і дадатковы заробак— зусім не лішні, — Андрэй не ўтойвае сваёй спрычыненасці да «марозных» спраў.

Яшчэ адзін дадатковы даход — весці вяселлі.

— Бізнес пачалі сёлета, таму пакуль што на маім «ліку» толькі шэсць «акальцаваных» пар. Зароблены такім чынам грошы ўвогуле не расходую, а адкладваю на будучыню. Там паглядзім, што з імі рабіць, — кажа хлопец.

Але гэта не ўсе захапленні «суровага металурга». На Беларускім металургічным заводзе ёсць свая каманда КВЗ. Называецца яна «Усе У Сталі», а Андрэй у ёй капітан. Можна сказаць, што ён з сябрамі каманду і стварыў. Зараз «Усе У Сталі» гуляе ў міжрэгіянальнай лізе КВЗ «Палессе».

Кіраўніцтва завода і прафсаюзны камітэт, дарэчы, каманду вельмі падтрымліваюць: аплачваюць рэквізіт, жыллё на час гульні і нават выдаюць камандзіровачныя. Яшчэ з камандай ездзяць балельшчыкі, а за прапушчаныя дні на працы КВЗ-шнікам усё роўна налічваюць сярэдні заробак.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Чырвоная стужка на нашых вачах ператвараецца ў арматуру. Андрэй «адшчыпвае» пробу.

— Не ведаю, адкуль пайшло словазлучэнне «суровыя металургі». Відаць, з усім вядомай перадачы «Наша Раша», — смяецца Андрэй. — У нас усе — звычайныя людзі. І я таксама не «суровы металург»…

…Мяняць працу Андрэй не збіраецца. На гэта ёсць некалькі прычын: атрыманая прафесія, блізкасць да месца, дзе нарадзіўся, і да сям'і, добрыя адносіны з калектывам і захапленні, якім хочацца прысвячаць свой час. Ён якраз з тых людзей, якія цэняць тое, што маюць сёння.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.
Мінск — Жлобін — Мінск.

Паспець усё!

МАНІТОР ДЛЯ ГЕЙМЕРА — НЕ ЗАСЛОНА АД СВЕТУ

Пра геймераў часта кажуць, што гэта абмежаваныя людзі, якія не маюць асабістага жыцця і суткамі напралёт сядзяць за камп'ютарам. Адным словам, своеасаблівыя «кібербатанікі». Геймеры, асабліва прафесійныя гульцы, сапраўды шмат часу праводзяць у кампаніі манітора, клавіятуры і мышкі. Але ў астатнім гэта звычайныя хлопцы і дзяўчаты, цікавыя і камунікабельныя, у якіх ёсць сям'я, сябры, іншыя захапленні, вучоба, праца. Проста яны шмат чаго паспяваюць. Развянчаць стэрэатыпы пра аматараў камп'ютарных гульняў мы папрасілі Паўла БАЗЫЛЮКА, які пакінуў сваё геймерскае мінулае, каб стаць каментатарам... кіберспартыўных дысцыплін.

— Паша, ты яшчэ вядомы як відэаблогер. Якое са сваіх амплуа ставіш на першае месца — геймер, блогер, каментатар, шоўмен?

— Геймерам я быў даўно, шэсць гадоў таму. Як звычайны падлетак, з задавальненнем праводзіў час за камп'ютарнымі гульнямі, і ў мяне гэта нядрэнна атрымлівалася. Але мая кар'ера кіберспартсмена скончылася даволі хутка. Шмат часу праводзіў сам-насам з камп'ютарам, удасканальваў сябе як прафесійнага геймера, але годныя вынікі так і не прыходзілі. Зразумела, што адсочваў усе кіберспартыўныя мерапрыемствы, слухаў, як іх каментуюць у інтэрнэце, і з цягам часу зразумеў, што хачу гэтым займацца. На той момант для Беларусі гэта было «новае слова». Пампаваў розныя праграмы, вучыўся з імі працаваць і вось так, можна сказаць, навобмацак вёў свае першыя трансляцыі, непасрэдна з дому. З'явілася свая аўдыторыя, і я пачаў актыўна карыстацца сацыяльнымі сеткамі. Мяне сталі заўважаць, запрашаць каментаваць той ці іншы кіберфэст.

— Бацькі, напэўна, былі супраць такога захаплення...

— Яшчэ б! Я вучыўся ў школе, потым быў тэхнікум. Паралельна працягваў гуляць на прафесійным узроўні. Трансляцыі маглі зацягвацца да позняй ночы, маці трэба рана на працу, а я вельмі эмацыянальна каментую штосьці там каля камп'ютара. Але, калі я атрымаў першую зарплату і прынёс яе матулі са словамі «Дзякуй, што цярпела», яна па-іншаму паглядзела на тое, чым я займаюся.

— Раскажы, калі ласка, пра спецыфіку працы каментатара кіберспартыўных дысцыплін.

— А яе, напэўна, і няма. Мы, як і спартыўныя каментатары, распавядаем пра тое, што бачым. Апісваем тое, што адбываецца на пэўным адрэзку гульнявой сцэны. Спецыфіка заключаецца толькі ў прадмеце аповеду і ўменні прааналізаваць дзеянні кіберспартсменаў.

— Тады іншае пытанне: навошта ўвогуле назіраць за тым, як нехта гуляе ў камп'ютарныя гульні?

— Усё проста: тыя, хто іх глядзіць, самі хочуць быць падобнымі да гульцоў. Існуе вялікае мноства цікавых чэмпіянатаў, якія праходзяць у розных краінах свету, і прызавыя там могуць складаць мільёны долараў. Уявіце, людзі сядзяць у зручных крэслах дзе-небудзь, умоўна кажучы, на Гаваях, гуляюць у камп'ютарныя гульні, а ім за гэта яшчэ і плацяць. Зразумела, што многія хацелі б апынуцца на іх месцы. Гэта як у футболе: усе хлопчыкі імкнуцца быць падобнымі да Леанеля Месі і Крышціяну Раналда, але гэта не значыць, што так яно і будзе *(усміхаецца)*. Гэтакі ж прынцып і ў кіберспорце.

— Дарэчы, чаму спаборніцтвы па камп'ютарных гульнях сталі называць спортам?

— З аднаго боку, мы прызвычаіліся, што спорт — гэта калі ты выконваеш якія-небудзь актыўныя дзеянні. З іншага боку, мы называем спортам шахматы, калі гульцы сядзяць на месцы і абдумваюць ходы. Дык вось у кіберспорце думаць трэба не менш. Акрамя гэтага, значную ролю адыгрывае зладжанасць. Для гэтага ўсе члены каманды вельмі шмат трэніруюцца, адточваюць сваё майстэрства, ладзяць спарынгі з членамі іншых каманд. Геймеры называюць гэта адным словам — «скіл» (ад англ. skill — «майстэрства», «узровень», «навык»), што можна інтэрпрэтаваць як самаўдасканаленне, саманавучанне.

— Як думаеш, чаму ў апошні час стала модным здымаць фільмы і серыялы пра геймераў?

— Кіно — гэта бізнес. Калі здымаюць падобныя фільмы, значыць, яны прыцягваюць у кінатэатры мільёны гледачоў па ўсім свеце. Акрамя таго, вобраз геймера прывабны сам па сабе: авантуры, прыгоды, грошы зноў-такі.

Той, хто хоча вучыцца і гуляць, — будзе вучыцца і гуляць. Той, хто хоча мець сям'ю і гуляць, — будзе мець сям'ю і гуляць.

— Але нярэдка рэчаіснасць у гэтых стужках не такая ўжо і прыгожая — крымінал і іншыя праблемы.

— Усё залежыць ад таго, пад якім «вуглом» глядзець тую ці іншую карціну. Напрыклад, для кагосьці фільм «На гульні» — гэта звычайны баявік, экшн, дзе адны хлопцы ганяюцца за іншымі. Для мяне ж гэта гісторыя пра барацьбу са злачыннасцю. Чым не добрая справа?

— З вобразам у кіно разабраліся. А ў жыцці? Намалюй партрэт сярэднестатыстычнага геймера.

— Звычайна гэта хлопец ад 16 да 28 гадоў, які ў дзень траціць каля васьмі гадзін на камп'ютарныя гульні. Пры падрыхтоўцы да спаборніцтваў кіберспартсмены, напрыклад, наогул праводзяць каля манітора 11-14 гадзін. Зразумела, што такі рытм жыцця (сон—гульня—сон) рана ці позна стамляе. Таму пасля трыццаці гадоў большасць геймераў адкладвае віртуальныя «стралялкі» ўбок і цалкам прысвячае сябе рэальнаму жыццю — кар'еры, сям'і, сябрам і г.д. Але ёсць і тыя, якія працягваюць спалучаць прыемнае з карысным: жэняцца і вяртаюцца ў камп'ютарны клуб разам са сваёй абранніцай. Не раз назіраў сітуацыю, калі хлопец «рубіцца» ў нейкую гульню, а за спінай стаіць жонка, апантана падтрымлівае, а потым кажа, напрыклад: «Я пайшла гатаваць вячэру, каханы. Скончыш — прыходзь» *(усміхаецца)*.

— А як жа байкі пра тое, што геймеры — гэта адзінокія, «забітыя» людзі, з якімі цяжка наладзіць кантакт?

— Самы распаўсюджаны міф! Пераважная большасць геймераў — вельмі камунікабельныя людзі, у якіх у жыцці ўсё выдатна. Мабыць, нясціпла, але мой прыклад паказальны. Я быў звычайным геймерам з Брэста, які ў выніку стаў адзіным у Беларусі кіберспартыўным каментатарам, працуючы ў цікавым праекце Game Show Studio, аналагаў якому няма ва ўсім СНД. Я таксама магу каментаваць гульні па восем гадзін у дзень, але гэта не перашкаджае мне хадзіць у клубы, гуляць у аматарскай футбольнай лізе, сустракацца з сябрамі, праводзіць час з каханай дзяўчынай. Геймеры — звычайныя людзі, і сярод іх таксама ёсць гультаі, якім неахвота вылазіць з-за камп'ютарнага стала і ісці на працу ці ў дзіцячы садок па дачку. Той, хто хоча вучыцца і гуляць, — будзе вучыцца і гуляць. Той, хто хоча мець сям'ю і гуляць, — будзе мець сям'ю і гуляць.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

З «базай» у галаве

ЗАПРАГРАМУЙ ЖЫЦЦЁ — ЗРАБІ ЯГО «АБ'ЁМНЫМ»!

Другакурснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Павел Літвінка ведае, як цікава і з карысцю для сябе правесці вольны час. Звычайна пасля заняткаў на факультэце 4-5 гадзін ён прысвячае напісанню камп'ютарных праграм. І не таму, што так патрэбна для вучобы, — проста гэта хлопцу сапраўды цікава.

Ад малявання да мадэлявання

У дзяцінстве і падлеткавым узросце Паша цікавіўся не столькі камп'ютарамі, колькі маляваннем і музыкай. І гэтаму было тлумачэнне: бацькі хлопца — мастакі. Маці і зараз працуе настаўніцай выяўленчага мастацтва ў школе, а бацька — мастаком-канструктарам. Павел таксама скончыў мастацкую школу, а тое, чаму навучыўся, стараецца не забываць.

— Калі прыязджаю дадому, іграю на сінтэзатары, спрабую самастойна падбіраць музыку, — расказвае малады праграміст.

Адзін з прызнаных яго праектаў звязаны менавіта з маляваннем. Гэта распрацоўка праграмы, што пераўтварае плоскі малюнак у аб'ёмную 3D-карцінку. Напрыклад, у звычайнай «малявалцы» (Paint) вы ствараеце домік або сонейка, а праграма надае малюнку аб'ём. Праект, які ён распрацаваў яшчэ ў школе, атрымаў другое месца на міжнароднай канферэнцыі маладых вучоных у Нідэрландах і трэцяе — на падобнай канферэнцыі ў Славакіі. У хуткім часе праграма прынесла хлопцу яшчэ адзін прыемны сюрпрыз: ён стаў стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Натуральна, перамогі на міжнародных конкурсах — гэта прыемна. Але мой суразмоўца ўпэўнены: трэба рухацца далей! Зараз ён працуе паралельна над некалькімі новымі праектамі, даволі цікавымі нават для неспецыялістаў.

Крок у будучыню

Адзін з іх звязаны з квантавым камп'ютарам — новым пакаленнем электронных вылічальных машын, якія ў тысячы разоў больш магутныя за тыя, якімі карыстаецца большасць зараз. Такі камп'ютар, дарэчы, па памеры будзе з кватэру, і гэтым ён нагадвае вядомага продка сучасных ноўтбукаў, які займаў, як вы памятаеце, цэлы пакой.

Квантавы камп'ютар у стане раскласці 150-значны лік усяго за паўгадзіны, у той час як наш звычайны пакаёвы «сябар» на такую справу патраціць 250 гадоў. Як сказаў мне «па сакрэце» Павел, камп'ютар новага пакалення можа ўзламаць амаль любую сучасную сістэму бяспекі, але распрацоўваецца ён зусім для іншых мэт — менавіта квантавы камп'ютар можа кардынальна змяніць усе цяперашнія падыходы да праграмавання, бо ён у шмат разоў больш хуткі, эфектыўны і прадуктыўны, чым звычайны.

Тайнае стане яўным

Пра студэнтаў-камп'ютаршчыкаў справядліва кажуць, што працаваць па спецыяльнасці яны пачынаюць ледзь не з першага курса. Вось і Пашы даводзіцца нават адмаўляцца ад некаторых замоў — выбірае толькі тое, што яму больш цікава.

Адзін з нядаўніх праектаў па замове — праграма, звязаная з кантролем над карыстаннем камп'ютарам. З яе дапамогай можна прасачыць усю актыўнасць карыстальнікаў як падчас звычайнай працы з рознымі праграмамі, так і ў інтэрнэт-сёрфінгу, нават калі ў браўзеры быў выбраны ананімны рэжым. Такая праграма карысная, перш за ўсё, для бацькоў, якія не хацелі б, каб іх дзеці заходзілі на пэўныя сайты, і для педагогаў. Праграма дапаможа таксама схаваць некаторыя папкі з асабістымі дакументамі, фотаздымкамі, якія не хацелася б паказваць іншым.

«Не» — хаосу на камп'ютары

Паралельна Паша працуе над праграмай пад назвай «Тэгер», якая дапаможа давесці да ладу файлы на вінчэстары. Як правіла, у многіх камп'ютарных папках чорт нагу зломіць. Усё можа змяшчацца ў адной папцы — і музыка, і гуказапісы, і аудыякнігі, і фільмы, і ўласныя відэаролікі, і чарнавік дыпломнай, і электронны варыянт шпаргалак з апошняй сесіі. А яшчэ часам атрымліваецца, што замест тых жа непатрэбных шпаргалак выдаляецца дыпломны праект! А ўсё з-за хаосу на камп'ютары!

Праграма зможа сама прасканаваць камп'ютарныя файлы і згрупаваць асобна музыку, тэкставыя файлы і відэазапісы. Яна таксама ў стане ідэнтыфікаваць, як жа насамрэч называецца спампаваны з інтэрнэту аўдыяфайл пад незразумелай назвай «765c739».

Псіхалогія праграміста

Паша з нецярплівасцю чакае новы сезон вядомага брытанскага серыяла

«Шэрлак» (знятага па матывах творчасці Артура Конан Дойла, толькі дзеянне з часоў «віктарыянскай» Англіі перанесена ў сучаснасць), дзе галоўны герой дзякуючы нестандартнаму мысленню разгадвае самыя заблытаныя крымінальныя справы. Што немалаважна, сучасны Шэрлак Холмс вялікую ўвагу надае камп'ютарным тэхналогіям. Як прызнаўся Паша, у людзях ён, акрамя адкрытасці і прыстойнасці, вельмі цэніць уменне мысліць крэатыўна, не так, як большасць.

— Толькі не трэба думаць, што я «батан»! — пратэстуе хлопец. — Я люблю бавіць час з сябрамі, яны, дарэчы, творчыя людзі: нехта піша вершы, нехта малюе, нехта спявае... Проста калі адны гадзінамі сядзяць у сацыяльных сетках або займаюцца камп'ютарнымі гульнямі, я гэты час выкарыстоўваю на тое, што мне сапраўды цікава. І так я адпачываю, а паралельна — атрымліваю практычныя навыкі.

Паша прызнаўся, што, акрамя інфарматыкі, малявання і музыкі, захапляецца псіхалогіяй:

— Яна для мяне цікавая як сама па сабе, так і з практычнага пункту гледжання. На маю думку, псіхалогія проста неабходная для праграмістаў. Толькі калі ты знаёмы з псіхалогіяй сярэднестатыстычнага карыстальніка, ты можаш зрабіць па-сапраўднаму зручны інтэрфейс праграмы.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

Нагода для знаёмства

САКРЭТЫ СПАКУСЫ, — альбо На што «вядуцца» хлопцы?

— Дзе знайсці нармальнага хлопца!? — прамаўляла часам мая суседка па пакоі, а пасля садзілася на ложак, прыціскалася да сценкі і сумна пазірала ў акно... Праз пару гадоў яе «прынц» пад'ехаў на машыне літаральна пад парог дома і сам пазнаёміўся з «гаротніцай». Цяпер вось дачку гадуюць. Што тут скажаш — пашанцавала... Каб сустрэць сапраўднае каханне ці хоць бы неабцяжараныя адказнасцю адносіны, не ўсім дастаткова проста пасумаваць каля акенца. Дзе і як «расстаўляюць сеткі» на моцны пол сучасныя дзяўчаты, мы вырашылі даведацца з першых вуснаў...

Накармі яго і... валодай

Алена ў студэнцкім інтэрнаце — самая папулярная дзяўчына, хоць і не прызнаецца ў гэтым. Замест «трэнікаў» яна апранае сімпатычны атласны халацік, сочыць, каб манікюр быў бездакорным, падводзіць вочкі. Усё б нічога, але дзяўчына так збіраецца... на інтэрнацкую кухню.

— Калі я паступіла, мама, відаць, вельмі хвалявалася, што «памру з голаду», а таму перш-наперш купіла

мне не ноўтбук які, а набор каструль і дзве патэльні, — з усмешкай расказвае Алена.

Спачатку — праверaныя «хатнія» стравы, пасля — рэцэпты з інтэрнэту і «імправізацыі». Хлопцы-студэнты, што забягалі на кухню, пачалі ўсё даўжэй спыняцца, каб «папускаць сліну», гледзячы на апетытныя ножкі. Курыныя, зразумела, тушаныя з часнаком і фасоляй, папярэдне замарынаваныя ў маянэзе. Самае цікавае, што Алена праз некаторы час пачала гэтых уладальнікаў галодных вачэй шкадаваць. Таго падкорміць, з тым падзеліцца... А вечарам многія ў надзеі на «працяг адносін» заходзяць на пасядзелкі.

— Я не ведаю чаму, але гэты спосаб рэальна працуе. Цяпер, калі нехта пытаецца, як спадабацца хлопцу, я раю што-небудзь яму прыгатаваць, — кажа Алена. На маё пытанне пра халацік і манікюр яна сціпла аджартоўваецца: «Не пашкодзіць!»

Выбраць лепшага з «маньякаў»

«Дазволь мне дакрануцца да тваёй пяшчотнай шыйкі, пакрыць яе пацалункамі, затым спусціцца ніжэй, а пасля — яшчэ ніжэй...» Гэта адно з самых бяскрыўдных паведамленняў ад хлопцаў, якое Каця паказала мне ў сваім ноўтбуку. Па яе словах, усе дзяўчаты, што збіраюцца знайсці сабе пару на сайце знаёмстваў, павінны быць гатовы адэкватна рэагаваць на такіх вось «ахвотных».

У свае дваццаць чатыры гады Каця перажыла непрыемнае расстанне з хлопцам, які шмат для яе значыў.

— Каб выйсці з дэпрэсіі, я пачала хадзіць да псіхолага, і ён параіў мне навучыцца проста весці стасункі з мужчынамі, размаўляць з імі, выказваць сваё меркаванне, слухаць і не «зацыклівацца» на абавязковай доўгатэрміновасці адносін.

Зарэгістраваўшыся на сайце, Каця была прыемна ўражана, што за першыя паўгадзіны ёй напісалі больш за 50 чалавек. Але, калі ўчыталася, уражанне крыху змянілася. Многія прапаноўвалі секс у першым жа паведамленні, але, не атрымаўшы адказу, шчыра здзіўляліся: «Ну што ты, не «ламайся!» Праўда, былі і нармальныя хлопцы, якія пісалі штосьці пра сябе, шукалі агульныя тэмы для размовы. Але калі такі трапіцца — лічы, пашанцавала.

— Вечарам я ўключала камп'ютар, каб праверыць паведамленні, і часам прыгаворвала: «Ну, як там мае «маньякі»? — смяецца дзяўчына.

Каця ўпэўнілася: у такіх пошуках нельга спадзявацца, што знойдзеш сваё каханне, але на з'яўленне ў жыцці цікавых суразмоўцаў і вясёлых сяброў-прыяцеляў можна разлічваць. Толькі вось ісці на спатканне пасля першых некалькіх паведамленняў — справа досыць рызыкоўная. Неяк па нявопытнасці Каця адважылася на сустрэчу з віртуальным знаёмым. Хлопец прыйшоў у расшпіленай куртцы (і гэта ў лістападзе!), пад якую... нічога больш не апрануў. Так што сярод «маньякаў» патрэбна выбіраць толькі самых адэкватных.

Калі ты ў клубе, яны «дурэюць»

Каб так і было, найпершая дзявочая задача — накупіць сабе кароценькіх сукенак і «цудадзейнага» абутку, у якім і танцаваць зручна, і ногі даўжэйшымі выглядаюць. Вераніка і Надзя, якія пасябравалі дзякуючы адной на дваіх здымнай кватэры, сцвярджаюць, што такія туфлі на шпільках існуюць. Яшчэ яны часта расказваюць пра знаёмствы з хлопцамі ў клубах.

— Многія дзяўчаты лічаць, што патрэбна прыйсці, сесці за барную стойку і «напусціць» на сябе непрыступны выгляд. Наадварот, пра такіх дзяўчат хлопцы адразу думаюць: «Ага, яна чакае прыгод!» — кажа Надзя.

Нейкіх спецыяльных прыёмаў «ахмурэння» дзяўчаты не выкарыстоўваюць. Усё проста: калі хочаш, каб цябе заўважылі, але не запісалі ў распусніцы, лепш прыходзіць у кампаніі, а яшчэ — пабольш танцаваць, не стаяць сціпленька збоку.

Вераніка, напрыклад, умее «запаліць» на танцпадлозе, а таму пакутаваць ад недахопу ўвагі ёй не даводзіцца:

— Я як заўжды «адрывалася», калі да мяне «падтанцаваў» хлопец, які прадставіўся Дзянісам. Мы пазнаёміліся і месяцы два хадзілі на спатканні. Усё скончылася, калі ў горадзе сустрэліся з... яго дзяўчынай!

Гэта, безумоўна, настрой сапсавала, але адмовіцца ад знаёмстваў у клубе не прымусіла. Дарэчы, у Веранікі і Надзі ёсць сяброўка, якая стала баяцца менавіта такім чынам знаёміцца пасля аднаго выпадку. Аднойчы да Яны падышла незнаёмая дзяўчына і пачала з ёю размову. Дзяўчаты ўвесь вечар танцавалі разам, смяяліся і жартавалі. Новая знаёмая нават дадому яе падвезла. А на наступны дзень «клубная» прыяцелька (прынамсі, менавіта так яе ўспрымала Яна) прыслала кветкі і паштоўку з прапановай... пачаць рамантычныя адносіны.

Новая сукенка — новае жыццё

У гардэробе Крысціны зараз амаль не знойдзеш зручных світараў, джынсаў і футболак. Яны дастаюцца з шафы толькі для паездак за горад. А на ўсе астатнія выпадкі жыцця — сукенкі, спадніцы, што шчыльна абцягваюць фігуру, кофтачкі з дэкальтэ.

— Першае, што я заўважыла, калі стала насіць менавіта такое адзенне: прасіць нешта ў мужчын стала нашмат прасцей. І знаёміцца з імі таксама. Дакладней, яны самі вельмі часта знаёмяцца. Дастаткова правільна павярнуцца, прайсціся, прыгожа сесці ці эфектна закласці нагу за нагу, — упэўнена Крысціна.

Менавіта так яна пазнаёмілася са сваім цяперашнім хлопцам, з якім сустракаецца амаль год. Як спадзяецца наша «чараўніца», сукенку, у якой яна была ў той дзень, будзе яшчэ дзецям і ўнукам паказваць.

— Я ні ў якім разе не кажу, што трэба пабольш усяго «агаліць». Проста ў вобразе павінна пераважаць жаноцкасць і прывабнасць, — сцвярджае Крысціна.

Галоўная перавага «сукеначнага» метаду, па яе словах, — гэта магчымасць прыцягнуць увагу хлопцаў дзе заўгодна: хоць у клубе, хоць у чарзе па шпалеры.

Сорам ці трыумф?

Юля безнадзейна закахалася, калі ёй было дзевятнаццаць гадоў. Хлопец вучыўся ў адной групе з яе суседкамі-пяцікурсніцамі, а таму часта заходзіў у пакой, дзе жыла дзяўчына. Аб'ект кахання з Юляй знаёміцца чамусьці не спяшаўся. Вітаўся толькі тады, калі сустракаліся ва ўніверсітэце, але ніводнага разу нават імя не спытаў. Прайшло паўгода, а Юля па-ранейшаму заставалася «мэбляй» у пакоі яго аднакурсніц.

— Чамусьці ў такіх выпадках сорамна не бывае, — кажа Юля і распавядае гісторыю, якая проста не можа здарыцца з «правільным», на першы погляд, чалавекам...

...Угаварыць суседак узяць яе з сабой пагуляць суботнім вечарам цяжкасці не склала. Ён таксама павінен быў пайсці. Што ж, сустрэліся: вечар, мароз, начныя вуліцы. Чым студэнты грэюцца? Вядома чым! Змесціва шклянкі Юля ўпотай вылівала ў снег, але сама рабіла выгляд што п'янее. («Альбо трыумф — альбо сорам! Трэцяга не дадзена!» —стала на той вечар яе дэвізам).

— Адвядзі мяне дадому! — з нечаканай смеласцю папрасіла яна ў непрыступнага пяцікурсніка. А той і не адмовіў! Суседкі заўсміхаліся двухсэнсоўна, развіталіся і рушылі гуляць далей.

— Мне так смешна ўспамінаць, як мы праходзілі міма вахцёркі, як у пакоі я зрабіла выгляд, што не магу сама скінуць боты, і яму прыйшлося іх з мяне сцягваць, — успамінае Юля.

Хлопец аказаўся сумленным, а таму, паклаўшы Юлю спаць, пайшоў да сябе. А што пасля? Юля кажа, што ніякіх рамантычных стасункаў паміж імі не здарылася. Такі крыху бязглузды крок, відаць, і быў лякарствам ад кахання.

Таццяна ГАЙС.

Свой стыль

У ТРЭНДЗЕ — БУЯННЕ ФАРБАЎ!

Выглядаць хораша і модна апранацца сёння імкнецца практычна кожны чалавек, якому неабыякавы яго знешні выгляд і меркаванне навакольных. Сучасная мода — альтэрнатыўная і разнастайная, што дазваляе любому быць непаўторным. Кіраўнік калектыву тэатра моды «Фэст» горада Наваполацка Ганна Волкава распавядае аб тым, як не застацца не заўважаным у натоўпе.

«Буянне фарбаў!» — такі зараз галоўны дэвіз моды. «Усё, што было модным летам, плаўна перайшло на наступную пару года», — падкрэслівае Ганна Апалінар`еўна. Калі казаць пра каляровую гаму, то ў гэтым сезоне дызайнеры аддаюць перавагу пяці колерам: ярка-зялёнаму, балотна-зялёнаму, насычанаму сіняму, карычнева-шакаладнаму і ўсім адценням чырвонага.

Яшчэ на спадніцах, кардыганах, сукенках (ды практычна на ўсіх прадметах адзення) робяцца малюнкі. **Прынт на тканіне** — сапраўдны трэнд восені.

Да нас вяртаецца **«рэтра»-мода**: пышныя спадніцы да калена (якія былі такімі модныміў часы Мэрылін Манро), вельмі вузкі стан з шырокім поясам... Тканіна спадніцы — твід, «шатландка». А калі захочацца здавацца трохі худзейшай, то можна выкарыстаць тканіну ў тонкую палосачку.

Вы не памыліцеся, калі набудзеце на гэты сезон **жакет**. Маленькія кароткія жакеты засталіся ў модзе яшчэ з мінулай восені. Яны могуць быць аблямаваныя футрам, без аздаблення, шытыя ці цалкам футравыя. У любым выпадку жакет будзе выйгрышна глядзецца як на элегантнай сукенцы, так і на простым світары.

«Калі дзяўчына думае пра паліто ці пінжак, то тут лепш выбраць аб'ёмныя і нават трохі мешкаватыя рэчы», — раіць Ганна Апалінар`еўна. Вяртаецца мода на двухбортнае паліто ў стылі «мілітары» і завужанае да нізу. Большасць мадэльераў цяпер робяць акцэнт на павялічаным аб'ёме плячэй.

Бацільёны таксама прадстаўлены на любы густ: замшавыя, з лакавымі ўстаўкамі, на тоўстых абцасіках і танкетцы, з адкрытым носам, на шнураванні, са спражкамі. Разнастайнасць па колеры, фактуры. Пад бацільёны можна надзець гольфы ці шкарпэткі. Якім бы смешным гэта ні падавалася, але варта звязаць доўгія ваўняныя панчохі, абуць бацільёны — і гэта будзе апошні «піск моды».

Шалікі з махеру. Іх яшчэ завуць «пухнатымі». Аксесуар, які прыйшоў да нас з моды 1980-х. Пальчаткі таксама ў модзе — даўжынёй да локця. На іх нанізваецца шмат самых разнастайных бранзалетаў. Чым больш колераў — тым лепш (бо дэвіз жа — «Буянне фарбаў!»).

Капелюшы. Асноўны «піск» сезона да нас прыходзіць з вясны — гэта, як ужо маглі здагадацца заўсёдныя моднікі, мужчынскія капелюшы. Варта заўважыць, што яны выдатна выглядаюць як на дзяўчынках і дзяўчынах, так і на дамах бальзакаўскага ўзросту. Гэта капелюшы з вялікімі ці маленькімі палямі, яркія ці класічныя.

Сумкі. Нашы вялікія сумкі, якія былі вельмі моднымі той восенню, у якія змяшчаўся ўвесь набор касметыкі, сышлі ў нябыт. А на модны «пастамент» узышлі маленькія сумачкі цераз плячо. З імі дзяўчаты здаюцца лёгкімі, жаноцкімі і трохі бестурботнымі, але галоўнае — вельмі рамантычнымі.

Вашым выратаваннем для ўрачыстых мерапрыемстваў можа стаць **стыль з налётам «этна».** Многія вітаюць тут афрыканскі кірунак — напрыклад, плямы «пад» леапарда, змей. Але мы жывём у Беларусі, таму трэба шукаць штосьці сваё, роднае. Можна нашыць карунак на пальчаткі, зрабіць аплікацыю на жакеце ці проста павязаць стужку на капелюшы. Этнастыль ствараецца лёгка і проста. Галоўнае — адчуць яго ўсёй душой.

...Як у выніку выглядае наша модніца? Гэта рамантычная асоба ў пышнай спадніцы да калена, маленькім жакеце ці світары з нарвежскімі ўзорамі. На шыі — махеравы шалік, а на галаве — мужчынскі капялюш. Упэўненая ў сабе і з выдатным настроем.

Але самае галоўнае — гэта індывідуальнасць! Можна сесці і самой звязаць шалік — і ты будзеш адна такая! Трэба знайсці ў сабе цікавінку і распрацаваць свой уласны стыль.

Арына КАГАЛЁНАК,
вучаніца 10 класа навaполацкай гімназіі № 2.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

SEX–БАЛЯСЫ

ТАРЫФ НА ПРАВА «НАЛЕВА»

У В'етнаме ўступіў у сілу закон, згодна з якім тых, хто падзецца на сужэнскай нявернасці, будуць... караць «рублём». Урад краіны прыняў такое рашэнне, бо лічыць праблему сямейнага адзюльтэру вельмі сур'ёзнай. Цяпер людзей, якія, не знаходзячыся ў афіцыйным шлюбе, жывуць як муж і жонка, або ўступаюць у сувязь з партнёрамі, што ўжо звязаны вузамі Гіменея, будуць штрафаваць на суму ад 45 да 145 долараў у эквіваленце. Кажуць, што на гэтым могуць не спыніцца і цягам часу ўвесці за сужэнскую здраду нават крымінальнае пакаранне: калі гэта прывядзе да сур'ёзных наступстваў кшталту распаду сям'і або самагубства некага з сямейнікаў... Ну, ад апошняга крый Божа, але вось штрафы...

Ніхто не спрачаецца, што любая дзяржава зацікаўлена ў здаровай і моцнай «ячэйцы грамадства». Вось толькі нешта падказвае, што гэтыя штрафы не пойдуць уласна пакрыўджаным сужэнцам. Зрэшты, нават калі б і так, пры агульным бюджэце гэта — як з адной кішэні ў другую грошы перакласці. А калі і асобныя бюджэты: хіба тыя купюры душу і сэрца заспакояць? Асадак жа, як той казаў, усё роўна застанецца... Зрэшты, нядаўна пачуў адну гісторыю. Хлопец жыў у грамадзянскім шлюбе з дзяўчынай. Потым «глыбока сышоў налева». А праз нейкі час вырашыў зноў вярнуцца да першай сваёй пасіі. Яна пра здраду ведала, але ранейшага кавалера назад прыняла — за пярсцёнак з брыльянтам коштам за 20 мільёнаў рублёў. Такі вось асабісты «тарыф» на дараванне...

Так, на Захадзе такія адступныя грошы — ужо даўно норма. Вось хаця б прыгадаць вядомых галівудскіх акцёраў Эштана Катчара і Дэмі Мур. Іх агульны сямейны капітал складае каля 300 мільёнаў долараў. Мур (якая, дарэчы, пасля скасавання шлюбу з Брусам Уілісам атрымала 90 мільёнаў «зялёных»), падазраючы Катчара ў нявернасці, хацела адсудзіць у яго палову таго, што ён зарабіў падчас іх сумеснага жыцця. Паводле апошняй інфармацыі, колішні сужэнец (дарэчы, адзін з самых высокааплатных акцёраў Галівуда) пагадзіўся выплаціць ранейшай каханай усё, што тая пажадае. Дамовіліся, значыць, паміж сабой.

А ў В'етнаме як? Найперш, хто будзе інфармаваць пра сямейную здраду «кампетэнтныя органы»? Няўжо як некалі ў нас? (Памятаеце жарт той эпохі: «Раней жанчыны бралі мужчын грацыяй, цяпер — партарганізацыяй»?..) Чаму адрозніваюцца памеры штрафаў і зыходзячы з чаго іх вызначалі? Які даследчыцкі інстытут? Па якіх крытэрыях? Па таўшчыні чаго — кашалька? Як увогуле штрафныя грошы «па касе» будуць праходзіць? Па якой таварна-касавай накладной? На якія мэты? Па пошце будуць дасылаць квітанцыю для аплаты на хатні адрас ці выклічуць куды? А «індульгенцыю» ў такім выпадку можна будзе набыць, каб кожны раз да касы не бегаць? Як у анекдоце. «Вы абразілі паліцэйскага! З вас штраф — 250 рублёў». — «На табе тысячу і слухай далей».

Карацей кажучы, на мой погляд, так сабе метад захавання маральнасці — пры ім дзяржава, складваецца ўражанне, як быццам бы яшчэ і спрабуе зарабіць на распусце! Там, дзе ўзнікае трохкутнік, тонкая душэўная сфера зусім па-іншаму рэагуе на матэрыяльна-грашовы бок жыцця. Памятаеце анекдот? Муж вяртаецца дадому і застае сваю жонку ў ложку з каханкам. «А я ўсё думаю, — кажа сужэнец з ухмылкай, — хто той небарака, чый дарагі спартыўны аўтамабіль, прыпаркаваны каля майго дома, толькі што падпалілі...» Але гэта яшчэ што! Вось зусім без смеху і жартаў: у Ганконгу жонка мае права... забіць здрадлівага сужэнца, але толькі голымі рукамі. Нішто сабе тарыф за права «налева», праўда? А палюбоўніцу мужа можна... пазбавіць жыцця ўжо любым спосабам. Пра фантазію падманутай раз'юшанай жанчыны тут лепш памаўчаць... Як і пра хітрасць мужчыны, які падазрае. («Размаўляюць камандзір самалёта, капітан цеплахода і вадзіцель-дальнабойшчык. Першы кажа: «Я, пралятаючы над домам, памахаю крылом — і дома мяне чакае накрыты стол». Капітан судна: «А я, заходзячы ў родны порт, даю гудок. І мая каханая бяжыць мяне сустракаць». У сваю чаргу, дальнабойшчык: «Калі вяртаюся з рэйсу, за кіламетр да дома глушу рухавік — і з пагорка накатам. Потым званю ў дзверы, а сам з манціроўкай — да «чорнага ўвахода». Яшчэ ніводны беспакарана не сышоў!..»)

Таму лепш, калі ўсё інакш, душэўна... Добрая жонка, праводзячы сужэнца ў камандзіроўку, заўсёды ласкава яму нагадае: «І памятай, любы: не трэба падчас паездкі траціць грошы на тое, што маеш дома бясплатна!» А калега па працы да таго дадала: «Лепшая гарантыя доўгага сямейнага шчасця — цяжкая патэльня...» Пажартавала, мабыць?

...Паспрабаваў прыгадаць «цікавыя» выпадкі з жыцця знаёмых. Дакладна ўспомніў толькі адзін, дваццацігадовай даўніны. Напярэдадні вяселля нявеста заспела ў ложку свайго будучага сужэнца з... лепшай сяброўкай. Быў даволі гучны скандал, вяселле адмянілася. Але потым у маладых нейкім чынам зноў усё зладзілася. Зараз жывуць, дзяцей гадуюць. Больш, на шчасце, нічога прыгадаць не магу. Можа, таму што край у нас партызанскі — маўчаць усе. Тут дарэчы чарговы анекдот: «Многіх радыёслухачоў-мужчын хвалюе пытанне: ці варта прызнавацца жонцы ў здрадзе? Сёння ў прамым эфіры на гэтую тэму выкажацца галоўны траўматолаг Міністэрства аховы здароўя»... Сапраўды, за памылкі часам даводзіцца плаціць. І па самым высокім тарыфе...

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«Я ВЕДАЮ СМАК САПРАЎДНАГА ШОУ-БІЗНЕСУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Можаш апісаць яго?

— На мой погляд, сапраўдны шоу-бізнес мае смак горкага шакаладу. Камусьці ён не падабаецца, а я ад яго ў захапленні. Бо гэта ж шакалад, хоць і горкі. Шоу «Акадэмія талентаў» і «Хачу ў ВІА Гру» нельга нават параўноўваць. У апошнім была рэальная барацьба за выжыванне. Трэба было прыйсці і паказаць, што ты альбо далучаешся да агульнай «зграі», альбо паказваеш, што з'яўляешся лідарам, і збіраеш сваю ўласную каманду. Таксама шоу-бізнес — гэта праца з ранку і да позняга вечара. І ты не можаш паказаць, што стаміўся ці дрэнна сябе адчуваеш. У мяне на праекце здарылася сапраўднае атручэнне. Я напілася таблетак і пайшла на рэпетыцыю, бо ў гэты дзень нам ставілі харэаграфію... Яшчэ сапраўдны шоу-бізнес — у многім несправядлівы, але трэба навучыцца мірыцца з гэтым, нават калі разумееш, што часам табе адмаўляюць не па прычыне, быццам ты не дацягваеш прафесійна, а проста з-за рашэння — цябе там не будзе. Варта толькі пачаць азірацца і аплакваць такія «няўдачы» — пачнеш падаць. Я, пакуль была на праекце, усё ўсмоктвала ў сябе, як губка. Запамінала парады, ацэньвала сітуацыі. Зразумела: не варта нічога баяцца, але і не трэба змешвацца з натоўпам, каб прасунуцца на яшчэ адзін тур у праекце.

— Ты па натуры лідар. Ці перашкаджала гэта ў камандной працы?

— У праекце мы ўсе сябравалі. Нават зараз, калі дзяўчаты, якія сталі новымі салісткамі гурта, прыедуць у Мінск, то мы абавязкова сустрэнемся. На самім шоу мне даводзілася часам чуць, быццам мяне баяцца. Разам з тым, да мяне многія прыходзілі, каб выгаварыцца і паплакаць, і я заўсёды знаходзіла патрэбныя словы для іх. Быць лідарам — не азначае быць дрэнным ці злым чалавекам. Гэта проста твая пазіцыя. Калі працуеш у камандзе, то ў кожнага могуць быць свае ўласныя амбіцыі, і трэба ўмець не толькі сябе паказваць на сцэне, але і іншым не перашкаджаць у гэтым.

— Паспрабаваўшы сябе не ў адным шоу талентаў, можаш сказаць, чаму ў нас многія артысты застаюцца незаўважанымі?

— Думаю, справа ў ментальнасці нашых людзей. Таленавіты чалавек можа не пачуць ніводнай пахвалы ў нас, пакуль яго не заўважаць за межамі краіны. Варта толькі некаму з вядомых расійскіх ці ўкраінскіх артыстаў звярнуць на цябе ўвагу, як і на радзіме пачнуць казаць: маўляў, а яна ж класная! Я, напрыклад, якой артысткай была да шоу, такой і засталася. Адзінае, што навучылася, — правільна працаваць на камеру. Але толькі Канстанцін Меладзэ адзначыў пра мой артыстызм, і да яго прыслухаліся. У нас пазіцыя большасці: «Мне ўсё роўна». А ў той жа Украіне гарой стаяць за сваіх артыстаў!..



— Раскажы аб працы над новым альбомам?

— Сёння я запісваю асобныя трэкі з рознымі кампазітарамі і дыджэямі. Леанід Шырын, напрыклад, добра разумее мой настрой і стварае для мяне класную моладзевую музыку. Яшчэ я працую з дыджэем Mikesam. Мы з ім робім танцавальную музыку. Нешта ў стылі групы «Серабро». З дыджэем Яшарам таксама працуем у гэтым кірунку. Але пакуль матэрыял, які напрацоўваецца, выпускаем у выглядзе сінглаў. Альбом планую выпусціць крыху пазней, і, безумоўна, хочацца, каб ён быў канцэптуальным.

— У чым будзе заключацца канцэпцыя?

— Думаю, гэта будзе альбом танцавальнай лірыкі. Той выпадак, калі кампазіцыю можна раскласці так, што і на танцпляцоўцы і за яе межамі яна будзе да месца. Бо варта прыбраць танцавальную аранжыроўку — і трэк ператворыцца ў лірычную песню з глыбокім сэнсам, дзе будуць пачуцці і перажыванні. Я б параўнала стылістычна гэта з творчасцю Макса Барскіх. Доўгі час мне не ўдавалася паказаць сваю ўнутраную сур'ёзнасць і шматграннасць, а на шоу «Хачу ў ВІА Гру» — атрымалася. Таму настаў час, каб запісаць такі альбом.

— Твая новая песня «Я не твая мара» расказвае пра каханне, якое мінула. Скажы, а ў тваім жыцці ёсць месца сапраўдным пачуццям?

— Для напісання музыкі мне заўсёды неабходна нешта адчуваць. Незалежна ад таго, будуць пачуцці ўзаемнымі ці без адказу, але без іх творчы працэс не ідзе. Закаханасць для мяне перш за ўсё стымул для творчасці. Аднак калі казаць пра сур'ёзныя адносіны ў маім жыцці, то пакуль яны не на першым плане, бо галоўнае для мяне — «адбыцца» ў прафесіі.

Алена ДРАПКО.

«ЦАЛУЮ І АБНІМАЮ»! ВАЗЬМІЦЕ МЯНЕ НА РАБОТУ...

У тым, што сучасныя школьнікі дапускаюць памылкі нават у элементарных словах і маюць вельмі аддаленае ўяўленне пра арфаграфію, вінаватыя сацыяльныя сеткі. Апытанне дырэктараў 214 брытанскіх школ паказала, што такога меркавання прытрымліваецца 70% выкладчыцкага саставу.

Школьнікі настолькі захоплены сайтамі тыпу «Фэйсбук» ці «Твітар», што зусім згубілі інтарэс да кніг. Між іншым, менавіта ў працэсе чытання фарміруецца так званае «адчуванне мовы». А ў сацыяльных сетках падлеткі кантактуюць пераважна са сваімі равеснікамі, мова якіх не вылучаецца ні граматнасцю, ні граматычна складанымі і стылістычна прыгожымі канструкцыямі. Многія нават не лічаць патрэбным праверыць граматнасць сваіх лістоў з дапамогай камп'ютара. А навошта?

Па словах Трэйсі Ньюбі, якая выкладае англійскую мову ў адным з каледжаў Усходняга Сасэкса, толькі двое ці трое з 10 школьнікаў 14-15 гадоў станоўча адкажуць на пытанне пра тое, ці чыталі яны ў апошні час кнігу. Аднак, калі пацікавіцца ў тых жа школьнікаў, ці заходзілі яны сёння ў «Твітар» ці «Фэйсбук», то абсалютна ўсе дадуць станоўчы адказ.

Паводле звестак Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця, сённяшняе пакаленне брытанцаў чытае намнога горш і горш лічыць у розуме, чым іх бабулі ці дзядулі. Міністэрства адукацыі Вялікабрытаніі б'е трывогу: ад працадаўцаў сталі рэгулярна паступаць скаргі на неадукаванасць маладых супрацоўнікаў, якія нядаўна скончылі школу ці каледж — тыя робяць памылкі ў рэзюме і ставяць «ХОХО» («цалую і абнімаю») напрыканцы дзелавога ліста.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: першы намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА, рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 22.434.
Нумар падпісаны ў 19.30 27.11.2013 г.

■ Кардыяпрафілактыка

ПРАВЕРЦЕ ДЗІЦЯЧАЕ СЭРЦА

У шэрагу школ сталіцы і абласных цэнтраў сёння адбудуцца незвычайныя заняткі са старшакласнікамі. Аб фактарах рызыкі і прафілактыцы хвароб сістэмы кровазвароту раскажуць дзіцячыя кардыёлагі, спецыялісты медуніверсітэтаў, Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, РНПЦ «Кардыялогія».

— Хваробы сістэмы кровазвароту — праблема многіх краін, у тым ліку Беларусі, бо гэта асноўная прычына інваліднасці і раптоўнай смерці, — тлумачыць **загадчыца прыёмна-кансультатыўнага аддзялення Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Алена ЗАСІМ.** — Нярэдка гэтыя захворванні пачынаюцца менавіта ў дзіцячым і падлеткавым узросце. У тым ліку пасля нейкіх перанесеных захворванняў. Тыя ж парушэнні сардэчнага рытму, тахікардыя могуць пачаць праяўляцца ў 10–15 гадоў, аднак замест сур'ёзнага абследавання дзецям дазваляюцца ўзмоцненыя фізічныя нагрузкі ў спартыўных гуртках і секцыях. Разам з тым, у раннім узросце закладваюцца і асноўныя фактары рызыкі ішэмічнай хваробы сэрца — лішняя вага, курэнне, нізкая фізічная актыўнасць. Артэрыяльная гіпертэнзія, ішэмія, парушэнні рытму, кардыяміяпатыі і атэрасклероз нярэдка пачынаюцца ў дзяцінстве, прагрэсуюць і аднойчы становяцца прычынай недзеяздольнасці…

Штогод у дзіцячым кардыяхірургічным цэнтры РНПЦ «Кардыялогія» аперыруецца каля 1000 дзяцей. Прыкладна столькі нараджаецца кожны год з прыроджанымі паталогіямі. Расце колькасць ранніх аператыўных умяшанняў, у тым ліку эндаваскулярных, якія дазваляюць пазбягаць адкрытых, траўматычных аперацый. Аперыруюцца дзеці на першым месяцы жыцця, неданошаныя з прыроджанымі парокамі сэрца.

Сёння праходзіць 1-я рэспубліканская кардыялагічная акцыя для дзяцей «Азбука здаровага сэрца».

Актуальнай праблемай дзіцячай кардыялогіі з'яўляюцца парушэнні сардэчнага рытму і артэрыяльная гіпертэнзія. Сёння ў краіне прымяняецца скрынінг усіх нованароджаных — выконваецца электракардыяграма. У выпадку выяўлення пэўных парушэнняў праводзіцца холтэраўскі маніторынг. Дзякуючы сутачнаму запісу артэрыяльнага ціску, іншым відам дыягностыкі ў апошнія гады рэгіструецца ўсё больш дзяцей з артэрыяльнай гіпертэнзіяй. Самае важнае тут — як мага больш ранняе выяўленне паталогіі.

Арганізатары акцыі паспрабуюць перадаць «азы» здаровага ладу жыцця менавіта школьнікам, якія пашыраць не толькі свае ўласныя веды аб магчымасці захавання здаровага сэрца, але, ёсць надзея, падзеляцца імі з бацькамі.

Святлана БАРЫСЕНКА

У Мінску на базе 22-й гарадской дзіцячай паліклінікі з удзелам кафедры педыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі працуе навукова-практычная школа «Прафілактыка артэрыяльнай гіпертэнзіі і метабалічнага сіндрому ў дзяцей і падлеткаў».

■ КХЛ

ТОЕ, ШТО НАТХНЯЕ «ДЫНАМА»

Ёсць такая народная мудрасць: «Адзін раз — выпадковасць, другі — супадзенне, а трэці — ужо тэндэнцыя». Беларускія хакейныя заўзятары, здаецца, толькі пачалі прывыкаць, што стагнацыя, у якой знаходзіцца «Дынама», — гэта тэндэнцыя, а «зубры» ўзялі ды і выйгралі два матчы запар. Спачатку перамаглі грозны магнітагорскі «Металург» (скажам, выпадковасць), а пасля — ніжнекамскі «Нафтахімік». А гэта моцны серадняк (дапусцім, супадзенне)… Сёння на «Мінск-Арэне» мінчане сустрэнуцца з чалябінскім «Трактарам». Ці здольныя «зубры» запісаць на свой рахунак трэцюю вікторыю запар і прэтэндаваць на тое, каб «пераможную заканамернасць» назваць тэндэнцыяй?

Любамір Покавіч другі раз запар прывёў «зброю» да перамогі.

Рабіць высновы наконт працы Любаміра Покавіча на пасадзе «выконваючага абавязкі галоўнага трэнера», напэўна, пакуль рана. Тым не менш факт застаецца фактам: славацкі спецыяліст другі раз выводзіць сваіх падапечных на лёд і другі раз святкуе перамогу. У хакейных кулуарах кажуць, што Покавіча прызначылі галоўным на некалькі матчаў: маўляў, каб паглядзець, што адбудзецца. І пакуль «эксперымент» уражвае: каманда паказвае характар! Упэўнена абыграць «Магнітку» — аднаго з лідараў усходняй канферэнцыі — безумоўна, прыемна. А вырваць перамогу ў «нафтахімікаў» на апошніх хвілінах матча прыемна ўдвая.

У гэтай сустрэчы «зубры» дэманстравалі характар не раз. Спачатку, калі саступалі ў першым перыядзе 0:2 і рэабілітаваліся трыма шайбамі запар — элемент нечаканасці. А пасля і ў канцы матча, калі Ягор Мілаўзораў прымусіў расчаравана ўздыхнуць усю «Мінск-Арэну», параўняўшы лік на табло. Шчыра кажучы, думала, быць авертайму. Дык не! Сёлетні навабранец «Дынама» Аляксандр Мацярухін яшчэ раз наглядна даказаў, чаму яго нездарма «паднялі» з экстралігі. Менш чым за дзве хвіліны да фінальнай сірэны форвард закінуў вырашальную шайбу (і другую за гульню) — 4:3.

Пасля матча Любамір Покавіч не выглядаў здзіўленым, разгубленым альбо выціснутым як лімон. Здавалася, ён і не сумняваўся, што падапечныя здольныя выцягнуць гэты матч. І славак гэта пацвердзіў: «Вядома, непрыемна, што ў меншасці госці змаглі закінуць нам шайбу. Тым не менш хлопцы не разгубіліся і выдатна спрацавалі, калі гулец саперніка быў ужо на лёдзе. Ведаеце, за некалькі хвілін да канца матча можна адыграцца, нават калі на табло лік 0:4. Але такое здараецца рэдка. Таму я вельмі задаволены вынікам, падобныя моманты натхняюць». Пасля Покавіч распавёў пра ператасоўкі ў складзе каманды, прызнаўся, што пра замену варатара на наступны матч яшчэ не думаў, і пры гэтым заставаўся прыемным, далікатным суразмоўцам, шчыра ўсміхаючыся і рэагуючы на кожнае віншаванне з перамогай каманды. Які кантраст! Неба і зямля, як кажуць.

Здаецца мне, «зубры» проста атрымалі ад настаўніка зусім іншае стаўленне да сябе і адчулі, што ў іх сапраўды вераць. А верыць у каманду, якая апынулася на самым дне, бывае вельмі няпроста. Падобныя моманты натхняюць!

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

Крынічка
«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.
Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ.
№ 34 (492)

ІГЛІЧНЫЯ: ПАДРЫХТОЎКА ДА ЗІМЫ

Спецыялісты раяць набываць толькі зімаўстойлівыя віды і гатункі іглічных, але ведаць бы, якія сюрпрызы паднясе нам чарговая зіма! Пры нешчаслівым збегу абставін пацярпець можа любая расліна, калі не падрыхтаваць яе да зімоўкі правільна.

Крона ў іглічных прачынаецца рана, часта калі карані яшчэ не могуць забяспечыць яе вільгаццю з-за мерзлай глебы. Адсюль абаранне ігліцы — распаўсюджаная праблема. Добра ўвільготненая глеба прамярзае на меншую глыбіню, што памяншае рызыку вясновых пашкоджанняў.

Замацаванне новых пасадак

Крона хвойнай расліны збірае шмат снегу. Калі будзе моцны снегапад пры плюсавай тэмпературы, на галінах можа наліпнуць такая снежная маса, што саджанцы, якія не паспелі ўкараніцца, выверне з каранямі. У чаканні снегападаў усе пасадкі бягучага года грунтоўна замацуйце расцяжкамі, каб выключыць нават невялікія зрухі: з-за іх абрываюцца дробныя карэньчыкі і зацягваецца тэрмін прыжывальнасці раслін.

Абарона ад апёкаў

Калонападобныя ядлоўцы, кіпарысавікі, гатункі туі, кроны якіх падгаралі ў мінулыя гады, і ўсе гатункі елкі канадскай трэба дадаткова абараніць ад сонечных апёкаў хованкай. Лутрасіл і іншыя ўкрыўныя матэрыялы не падыходзяць: пад імі акумулюецца сонечнае цяпло, а

нам якраз гэтага і не трэба. Мэта хованкі — прыцяніць крону, не дазволіць ёй награвацца. Добра выконваюць гэтую функцыю мешкавіна, спецыяльная прыценачная сетка або нават тканыя поліпрапіленавыя палотнішчы. Іх накладваюць на расліну і абвязваюць (не прыціскаючы галіны моцна!). Не імкніцеся замураваць крону наглуха — няхай застануцца «прадухі». Буйныя асобнікі досыць прыцяніць толькі з паўднёвага боку.

Звязванне кроны

